ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

| | |
|---|---|
| На 1 мес. | — 90 к. |
| „ 3 мес. | 2 р. 60 к. |
| „ 6 мес. | 5 р. — |
| „ 12 мес. | 9 р. 75 к. |

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасля тэксту—50 к., іншагародніх абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаванні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбаўкі.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

| | |
|---|---|
| Рэдактар | 10-74 |
| Сакратар | 6-19 |
| Партсэктар | 13-80 |
| Сэктар інфармацыі | 13-80 |
| Начны рэдактар | 6-42 |
| Галоўная кантора | 7-81 |
| Аддзел падпіскі | 7-81 |
| „ абвестак | 7-81 |

ПАНЯДЗЕЛАК 7 красавіка 1930 г. № 81 (3589) Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

## ГЕНЭРАЛЬНАЯ ПРАВЕРКА ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЯЎБЫ

# Пастанова ЦК аб новых ільготах выклікае прыліў у калгасы

## МАБІЛІЗУЕМ ПРАЦОЎНЫ ЎЗДЫМ КАЛГАСНЫХ МАС І ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК НА ПАСЬПЯХОВАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ

Бліжэйшая практычная задача калгасаў заключаецца ў барацьбе за сяўбу, у барацьбе за найбольшае пашырэньне пасеўных плошчаў, у барацьбе за правільную арганізацыю сяўбы. Да задачы сяўбы павінны быць прыстасаваны зараз усе іншыя задачы калгасаў. Рабоце па арганізацыі сяўбы павінны быць падначалены зараз усе іншыя віды работы ў калгасах. (СТАЛІН).

## Правільная арганізацыя сяўбы—такая задача

Мы зьяўляемся сьведкамі масавага руху асноўных пластоў вёскі за новыя сацыялістычныя формы гаспадаркі. Усё больш і больш вымалёўваюцца перад пераважнай часткай сялянства пераваг буйной калектыўнай гаспадаркі перад дробнай, індывідуальнай. Ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы адбываецца працэс разьвіцця і замацаваньня калгасаў. Ва ўмовах непрымірымай барацьбы з кулаком, з клясавым ворагам мы дабіліся посьпехаў, якія сьведчаць аб тым, што «карэнны паварот вёскі да сацыялізму можна лічыць забясьпечаным» (Сталін). Беларуская рэчаіснасьць штодзённа, штогадзінна пацьвярджае гэтыя словы т. Сталіна.

Але побач з гэтымі бясспрэчнымі. яснымі для ўсіх і кожнага дасягненьнямі і перамогамі ў радзе раёнаў і округ мясцовымі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі быў дапушчаны рад памылак і скрыўленьняў. І гэтымі памылкамі, гэтымі скрыўленьнямі ясных і катэгарычных дырэктыў цэнтральных органаў партыі, галоўным чынам, тлумачыцца той буйны адліў з калгасаў, сьведкамі якога мы зьяўляемся ў радзе раёнаў БССР.

Якія асноўныя памылкі былі дапушчаны ў калгасным будаўніцтве? У сваім апошнім артыкуле «Адказы таварышам калгасьнікам» т. Сталін даў вычарпальны адказ. Гэта — парушэньне ленінскіх прынцыпаў добраахвотнасьці, уліку спэцыфічных умоў паасобных раёнаў, перакоканьне праз незакончаную ніпчэ форму калгаснага будаўніцтва. Гэтыя тры памылкі мелі ў сваёй аснове адну галоўную—няправільны падыход да серадняка, які ударыўся ў некаторых мясцох. Тав. Сталін падкрэсьлівае, што «асновай калгаснага руху зьяўляецца ў даны момант саюз рабочае клясы і беднаты з серадняком супроць капіталізму наогул, супроць кулацтва асабліва. Покуль наступленьне вялося адзіным фронтам з серадняком, усё ішло добра. Але калі некаторыя таварышы, упішыся посьпехамі, сталі нядрыкметна спаўзаць са шляху наступленьня на кулака на шлях барацьбы з серадняком, тады яны у гонцы за высокім процантам калектывізацыі, сталі ўжываць, да серадняка тваротныя мэтады, пазбаўляючы яго выбарачага права, «раскулачваючы» і экспрапрыюючы яго—наступленьне стала скажацца, адзіны фронт з серадняком стаў падрываца і, ясная справа, кулак атрымаў магчымасьць прабаваць зноў стаць на ногі».

«У гэтым корань памылак у сялянскім пытаньні»—піша далей тав. Сталін.

Партыя ня раз паказвала і папераджала, што, ня гледзячы на масавае імкненьне асноўных пластоў вёскі да калектывізацыі, магчымы хістаньні серадняка. Але клясавая барацьба не паслабляецца. Наадварот, яна павінна няміпуча ўзмацніцца. Клясы ня выходзяць з арэны гісторыі без адчаянага супраціўленьня. Кулак не здае сваіх пазыцый бяз жорсткай барацьбы. Ён змагаецца па-за калгасам, супроць калектывізацыі. Ён дзе-ні-дзе пралязае ў калгас і змагаецца ўнутры, за яго развал. Ён прабуе працягнуць, заваяваць серадняка. Ясна, якое асабліва вялізарнае значэньне набывае ў гэтых умовах праца сярод беднаты, арганізацыі беднаты. Цесны саюз з серадняком немагчымы без моцных арганізацый беднаты. Узмацняючы нашу апору на вёсцы—беднату, мы гэтым самым узмацняем блёк беднаты з серадняком.

Толькі безнадзейныя правыя апартуністы могуць недаацэньваць значэньня груп беднаты. Толькі яны могуць гаварыць аб патуханьні клясавай барацьбы.

«Левы» загіб, не даацэньваючы важнасьць саюзу з серадняком, льле ваду на млын правых апартуністых, узмацняе іх пазыцыі.

Практыка калгаснага руху ў БССР цалкам пацьвярджае гэтыя словы.

Мы павінны канстатаваць, што работа з беднатой у нас вельмі кульгае. Пастанова партыі аб неабходнасьці ўзмоцненай арганізацыі беднаты, аб групах беднаты пры калгасах многімі арганізацыямі злачынна ігнаруецца. «У нас няма беднаты», «у нас бедната нявартая», «навошта працаваць з беднатой, калі асноўныя масы ўвайшлі ў калгасы»—часта чутны галасы з боку мясцовых працаўнікоў. Такія зьявішчы ідуць побач з адшаведнай практыкай. «Зьвязда» ўжо пісала аб радзе абураючых выпадкаў роспуску груп беднаты. Чытач «Зьвязды» ўжо знаёмы з абураючай практыкай Нараўлянскага раёну, дзе ў выніку роспуску груп разваліліся 5 калгасаў (гл. учарайшы нумар нашай газэты). І, надварот, у радзе раёнаў, дзе была паленшана праца з беднатой, дзе былі ўзмоцнены групы беднаты, там мы маем прыліў у калгасы, зварот туды раней падаўшых заявы аб выхадзе. Такім чынам, слабая работа сярод беднаты, невыкананьне адшаведных дырэктыў ЦК—адна з прычын адліву з калгасаў, хістаньня серадняка, якія выявіліся ў паасобных мясцох.

Партыя артыкулам т. Сталіна і пастановаю ЦК УсеКП(б) запатрабавала неадкладнага выпраўленьня дапушчаных памылак і пераводу калгасаў на новы статут. Партыя патрабавала ад мясцовых арганізацый стаць на чале кіраўніцтва барацьбы з перагібамі. Але, ня гледзячы на гэта, рад мясцовых працаўнікоў аказаў супраціўленьне правядзеньню ў жыцьцё катэгарычнае дырэктывы ЦК УсеКП(б). Справы Шклоўскага і Рагачоўскаг райкомаў сталі ўжо шырока вядомымі. Сёньня мы друкуем матар'ял аб партыйным кіраўніцтве Грэскага раёну. Тут, нават, пасьля артыкулу т. Сталіна, пасьля апублікаваньня новага статуту, сакратар райкому заявіў: «А калектывізацыю будзем праводзіць прымусам». Тут, нават, абвясьцілі байкот паасобным вёскам. Тут, пад сьцягам калектывізацыі, тварылі контр-рэвалюцыйную справу. Тут унтэр-прышыбеевы развалілі калгаснае будаўніцтва.

У некаторых раёнах многа часу патрацілі на злачынныя, недапушчальныя разважальні аб мэтазгоднасьці ажыцьцяўленьня апошніх паказаньняў цэнтральных органаў партыі. Шмат часу спрачаліся—ці патрэбна пакідаць у індывідуальным карыстаньні калгасьніка кароўку і дробную жывёлу. Шмат антыпартыйных заяў ад нейкім адступленьні, аб нейкай здачы пазыцый клясаваму ворагу і надзвычай мала практычнае работы для хуткага зьніжэньня галаванняскіх памылак, для сапраўднага ўзмацненьня калгасаў. Кароўка, сьвіня, закрылі сабой перад такімі працаўнікамі калгасную праблему ў цэлым. Тут нашы працаўнікі, нашы арганізацыі пі растлумачвалі артыкул т. Сталіна і новы статут. Кулак скарыстоўваў марудныасьць, непаваротлівасьць нашых арганізацый, кулак панёў шалёную агітацыю за развал калгасаў. І ў такіх мясцох пачаўся адліў з калгасаў. У такіх мясцох нашы працаўнікі сапраўды здавалі пазыцыі клясаваму ворагу.

Цяпер партыя і ўрад выдалі рад важнейшых пастаноў аб ільготах калгасам. Асобныя весткі, атрыманыя з месц, гавораць аб тым, што ў выніку растлумачэньня гэтых пастаноў, пачаўся новы прыліў у калгасы. Усе партыйныя арганізацыі павінны ў найбольш кароткі тэрмін давесьці да ведама самых шырокіх пластоў вёскі гэтыя новыя партыйныя дакументы. Павінна пачацца ўпартая растлумачальная работа, якая няміпуча прывядзе да ўзмацненьня калгасаў, да іх далейшага росту.

Зараз галоўнае, асноўнае — падрыхтоўка калгасаў да сяўбы, паварот да вырашэньня іх гаспадарчых праблем. Рашучая барацьба са спажывецкімі тэндэнцыямі, усялякае заахвочваньне вытворчых стымулаў. Нельга забываць, што прыкладна пастаўленая праца з беднатой, добра арганізаваны выхад у поле, прыкладна праведзеная сяўба,—лепшы агітатар за калгас. Ад пасьпяховага правядзеньня сяўбы ў многім залежыць лёс калгаснага руху, яго разгортваньне.

Таму ўсю сілу, усю энэргію—на бальшавіцкае правядзеньне сяўбы. Пашырыўшы пасеўныя плошчы, павысіўшы ўраджайнасьць, арганізаваўшы працу і вытворчасьць у калгасах, рашуча выпраўшы дапушчаныя раней памылкі, узмацніўшы барацьбу з кулаком, мы дабіемся новых перамог, новых шпаркіх і рэальных тэмпаў калектывізацыі.

## Канфэрэнцыя „дваццаціпяцітысячнікаў“

### Пры умелай рабоце сярод беднаты мы маем новы прыліў у калгасы

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Гэтымі днямі ў Бабруйску адбылася першая канфэрэнцыя рабочых, якія вылучаны на пастаянную работу ў калгасы. Актыўнасьць делегатаў надзвычайная. З 50 удзельнікаў канфэрэнцыі ў спрэчках выказалася 35. Усе выступленьні прасякнуты жаданьнем, як найлепш і найхутчэй выправіць дапушчаныя памылкі, перамагчы труднасьці і замацаваць і ашчэ больш разгарнуць калгасны рух.

Многія рабочыя, якія выступалі ў спрэчках, прыводзілі факты перагібаў і адміністраваньня пры арганізацыі калгасаў і адсутнасьці ўсякай работы сярод беднаты. У калгасе «Старая Рудня» дайшлі да таго, што пастанавілі абагуліць... па дзьве курыцы з кожнай гаспадаркі.

Калі старшыня Стара-Рудзянскага куставога аб'яднаньня Раманькоў пастаўў у Пірэвіцкай ячэйцы КП(б)Б пытаньне аб арганізацыі ў калгасе бядняцка-батрацкай групы, яму адказалі: «навошта яна, ёсьць-жа такая група пры сельсавеце».

А вось факты галаванцяства з дзейгасьці акруговых работнікаў. Так, Старасельскі куст, які аб'ядноае чатыры калгасы з 142 гаспадаркамі, атрымаў 18 вагонаў вапны і зараз яе няма куды дзявацъ. Два вагоны вапны ляжаць ужо пад адкрытым небам, а вапну ўсё прысылаюць.

Вялікая блытаніна выйшла і з жывёлай. Пасылалі яе ў калгасы бяз усякага пляну. У Стрэшанскі куст былі прысланы каровы, якім «чырвоная папка»—55 руб., але акруговы малочны жывёлагалоўчы саюз залічыў іх на 320 руб. 12 цялят, прысланых у калгас «Ніва», Рагачоўскага раёну, былі ацэнены малочным саюзам у 970 руб.

Рэзка крытыкавалі делегаты работу куставых аб'яднаньняў. Усе прамоўцы адзначалі, што ўсе куставыя аб'яднаньні закідваюць калгас паперкамі, але вельмі мала дапамагаюць у практычнай рабоце.

Делегаты на радзе прыкладаў давялі, што пры ўмелай рабоце сярод беднаты мы маем новы прыліў заяў у калгасы. Яны заклікалі, каб пабальшавіцку ўзяцца зараз-жа за выпраўленьне памылак, каб падрыхтаванымі выйсьці ў поле.

Амаль усе делегаты скардзіліся на тое, што прадпрыемствы, якія іх вылучылі, зусім забыліся пра іх. Сувязь прадпрыемстваў з вылучанымі рабочымі нікуды нягодная. Нават не адказваюць на лісты вылучаных рабочых.

Делегаты абяцалі прыкласьці ўсе намаганьні, каб замацаваць калгасы і дапамагчы ім засеяць яравы клін.

М.

## Упарта супраціўляюцца ажыцьцяўленьню дырэктыў партыі

### Унтэр-прышыбееўскія мэтады ў Касьцюковічах ня спыняюцца

Мы паведамлялі ўжо аб тых скажэньнях лініі партыі і грубых памылках, якія былі дапушчаны касьцюковіцкімі работнікамі пры арганізацыі калгасаў. Мы паказвалі, якім шляхам гэтыя памылкі трэба выпраўляць («Зьвязда» № 70).

Але замест хуткага выпраўленьня памылак, дапушчаных у раёне, некаторыя кіраўнікі абурыліся артыкулам, зьмешчаным у «Зьвязьдзе». Яны, бачыце, лічаць, што ў іх памылкі ёсьць, але зусім... незначныя.

Сёньня мы падаем рад новых фактаў грубага парушэньня лініі партыі і ўпартага нежаданьня выконваць апошнія ня дырэктывы з боку касьцюковіцкіх «калектывізатараў».

У Нізкаўскім сельсавеце існуе старая камуна «Савецкая Беларусь», якая мае 250 гэктараў ворнай зямлі. Згодна «схэматычнага пляну суцэльнае калектывізацыі Касьцюковіцкага раёну», гэта камуна павінна была ахапіць тэрыторыю двух сельсаветаў.

У пагоні за процантамі, за колькасьцю ў гэтых сельсаветах некаторыя горакалектывізатарамі ўжывалася адміністраваньне.

Абагуленых коняй некалгасьнікаў скарыстоўвалі на лесазагатоўках і нічога ім за гэта не плацілі. Для паездкі на сваіх справах сялянам коняй не давалі.

У выніку такое «калектывізацыі» за апошні час пачаўся адліў з камуны. Камуна дагэтуль не пераведзена на статут сельска-гаспадарчай арцелі. Старшыня камуны Малюга заціскае калгасьнікам рот і ўсякага, хто з ім нязгодзен, называе контр-рэвалюцыянэрам.

Частка калгасьнікаў патрабавала, каб пэўную долю грошай за лесазагатоўкі выдавалі ім на рукі. Старшыня камуны Малюга, член партыі, кваліфікаваў гэта, як контр-рэвалюцыю. Па яго ініцыятыве за гэта былі выключаны з камуны на 3 месяцы з пазбаўленьнем права на паёк трое сялян сераднякоў. Гэта прывяло да таго, што ў камуне ніякай самакрытыкі ня існуе.

Малюга ў сваім адміністрацыйным запале пайшоў і далей, параспаўшы замяніць сабою савецкую ўладу. Пад яго націскам савет камуны пастанаўляе: «прапанаваць Негінскаму сельсавету ў хуткім часе ўзяць усю маемасьць царквы на вучот».

Як-жа ўсе гэтыя памылкі і грубыя скажэньні лініі партыі выпраўляліся партыйнай ячэйкай і саветам камуны?

Заслухаўшы інфармацыю Малюгі аб артыкуле т. Сталіна, савет камуны пастанавіў: «праробленую працу па калектывізацыі замацаваць, не адступаючы назад. Сачыць за тымі, хто вядзе агітацыю сярод камунараў аб рэарганізацыі камуны і даводзіць да ведама савету камуны».

Такім чынам, па думцы Малюгі і іншых членаў савету камуны, тав. Сталін даў дырэктыву адступаць, а яны настолькі разумныя, што парашылі не адступаць...

29-га сакавіка па тэрыторыі камуны адбыўся абураючы факт. Па загаду старшыні камуны Малюгі група камунараў (Бялаеў, Лосеў, Шапароў, Галапэўскі, Анапрэенка) зьявілася да селяніна-серадняка вёскі Антонаўка Лапікава Рыгора, які ня ўступіў у камуну, зламала ў яго хляве замкі і забрала 4 вазы сена і 3 вазы кармовае саломы.

Калі Лапікаў запытаўся, на якой падставе гэта робіцца, яму пачалі пагражаць. Тады Лапікаў пачаў прасіць, каб не ламалі замкі, пакуль ён не прывядзе самога Малюгу. Але, ня гледзячы на яго просьбу, замкі былі зламаны.

Лапікаў паехаў да Малюгі, але дарэмна.

А вось яшчэ адзін факт галаванцяства і скрыўленьня партыйнай лініі ў Касьцюковіцкім раёне.

У пастанове СНК БССР ад 21-га сакавіка зусім выразна сказана, што бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам, якія не ўвайшлі ў калгас, плошча пад яравы клін адводзіцца асобна ад калгасу ў межах зямлі данай вёскі, выходзячы з норм зямлякарыстаньня, якія вызначаны ў акладных лістох на с.-г. падатку. Але вось праўленьне Касьцюковіцкага калгасу «Парыская Камуна» ўпарта не жадае выконваць гэтай пастановы ўраду БССР. Зараз, пад уплывам кулацкай агітацыі і няўмелай работы праўленьня, у калгасе засталося 50 гаспадарак. Зараз праўленьне арцелі замест растлумачальнай работы сярод бедняцкіх і сераднякоў на аснове апошніх дырэктыў партыі імкнецца прымусовым парадкам вярнуць іх у калгас. Гэтым гаспадаркам яўсім не адводзіцца зямля для яравога кліну. Пры гэтым члены праўленьня разважаюць так: «вось няхай толькі падыдзе вясна, усё роўна яны нікуды ня дзенуцца і запішуцца ў калгас».

Палітычна блізарукае праўленьне калгасу «Парыская Камуна» не вядзе ніякай работы сярод беднаты і нічога ня робіць для замацаваньня саюзу з серадняком. Старшыня праўленьня, якому было даручана арганізаваць групу беднаты на працягу двух месяцаў, гэтага заданьня ня выканаў, і пры калгасе групы беднаты зараз няма. Старшыня Сачнёў, каб апраўдаць сваю бязьдзейнасьць, высунуў новую тэорыю: «Наша бедната бузацёрская», так кажа Сачнёў. З гэтага ён робіць вывад, што сярод беднаты ніякай работы весьці непатрэбна.

Вышэй паданыя факты сьведчаць аб тым, што партыйныя і савецкія кіраўнікі Касьцюковіцкага раёну, якія дапусьцілі рад скажэньняў лініі партыі і перагібаў, ня толькі нічога ня робяць, каб іх выправіць, а наадварот, яшчэ больш іх паглыбляюць і ўпарта не жадаюць праводзіць у жыцьцё апошніх дырэктыў партыі. Зразумела, што такое кіраўніцтва ня можа дабіцца далейшага замацаваньня і росту калгаснага руху. Касьцюковіцкае кіраўніцтва павінна быць абноўлена.

Брыгадзір «Зьвязды» ВОІНАЎ.

## Зараз-жа ліквідаваць заўважаныя недахопы

### Пастанова Менскага акругкому

Менскі акруговы камітэт партыі заслухаў вынікі праверкі падрыхтаванасьці акругі да сяўбы і работы акруговых установаў і вынес рад пастаноў.

Абвешчана вымова старшыні праўленьня акрпаляводсаюзу Буткевічу і яго намесьніку Шаевічу за нядбайныя адносіны да арганізацыі ў калгасах машына - конных станцый, за слабую работу па кантрактацыі, асабліва ў індывідуальным сэктары.

Старшыні акрмалжывсаюзу тав. Казаку абвешчана вымова за дрэнную арганізацыю месячніка жывёлагадоўлі, слабае правядзеньне кантрактацыі, невыстарчальнае кіраўніцтва раённымі малочнымі саюзамі і малочнымі т-вамі.

Трэцяму акрмалгассаюзу за несваячасовы і слабы арганізацыйна-гаспадарчы і фінансавы сыстэмы, слабую практычную дапамогу калгасам таксама абвешчана вымова.

За нядбайныя адносіны да збору попелу з боку праўленьня Белжылсаюзу (затрачана на яшчыкі 20.000 руб., а сабрана попелу на 300 руб.)—справу гэту перадаць у пракуратуру для пацягненьня вінаватых да судовай адказнасьці.

Усім акруговым установам запрапанавана зараз-жа ліквідаваць заўважаныя ў часе праверкі недахопы і перабудаваць сваю работу так, каб забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне калектывізацыі і падрыхтоўку да веснавой сяўбы. У прыватнасьці, запрапанавана зараз-жа ўжыць мерапрыемствы да забесьпячэньня пашырэньня пасеўнае плошчы. Шырока папулярызаваць закон аб новым сельска-гаспадарчым падатку і аб ільготах калгасам. Тэрмінова скончыць узбуйненьне саўгасаў, афармленьне калгасаў, перавод іх на новы статут, землеўпарадкаваньне і адвод яравога кліну індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, якія ня ўступілі ў калгас.

Акруговым установам запрапанавана прыняць рашучыя крокі да забесьпячэньня саўгасаў і калгасаў, а таксама індывідуальных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак сельска - гаспадарчым інвэнтаром. Скарыстаць максымальна час для рамонту інвэнтару, арганізаваць на час сяўбы паходныя кузьні і рамонтныя брыгады. Акрамя таго, пастановлена безадкладна выканаць пляны арганізацыі малочных ферм, узмацніць колькасьць дастаўкі малака ў Менск па кантрактацыі, закончыць кантрактацыю жывёлы і г. д.

Для большага замацаваньня якаснай работы калгасаў акруговым установам запрапанавана правесьці дадатковую мабілізацыю спэцыялістых з апаратаў устаноў.

Фракцыі АВК даручана на аснове пастаноў акругкому даць канкрэтныя заданьні раёнам і ўстановам і прасачыць за іх выкананьнем.

## Апублікаваньне артыкулу т. Сталіна і пастановы аб новых ільготах выклікала прыліў у калгасы

ПУХАВІЧЫ, 6. (Па тэлефону). У калгасы і вёскі раёну выехалі ўсе члены райкому, рад мясцовых актывістых для растлумачэньня артыкулу т. Сталіна «Адказы таварышам калгасьнікам» і пастановы ЦК УсеКП(б) аб новых ільготах калгасам і калгасьнікам.

Першыя два дні растлумачальнай працы ўжо далі канкрэтныя вынікі. Як калгасьнікі, так і беднякі і сераднякі, якія не ўвайшлі ў калгасы, спаткалі пастанову ЦК УсеКП(б) і артыкул т. Сталіна з вялікім задавальненьнем. Сялянская маса выяўляе вялікую зацікаўленасьць гэтымі дакумантамі і абмяркоўвае іх самым дакладным чынам. Пастанова аб новых ільготах калгасам і калгасьнікам зьмяніла настрой нават упарта нежадаючых уступіць у калгасы. Тыя-ж беднякі і сераднякі, якія раней хіталіся і ніяк не маглі вырашыць пытаньне, ці уступаць у калгас, ці не, зараз ужо адкрыта выказваюцца за уступленьне ў калектыў.

Сёньня ў Пухавічах атрымана паведамленьне аб выніках азнаёмленьня з артыкулам т. Сталіна і пастановай аб ільготах калгасам з двух калгасаў. У калгасе «Птычч», в. Варонічы, гэтыя дакументы з асаблівай зацікаўленасьцю абмяркоўваліся на спэцыяльных сходах як калгасьнікамі, так і беднякамі і сераднякамі, якія не ўвайшлі ў калгас. Апублікаваньне артыкулу т. Сталіна і пастановы ЦК УсеКП(б) выклікала вялікі ўздым усяго сходу. У канцы скліканьня сходу, пасьля таго, як ён адбыўся, 5 сераднякоў і беднякоў, якія раней не хацелі ўступіць у калгас, падалі заявы аб тым, каб іх прынялі ў калектывы. На заўтра яшчэ 10 беднякоў і сераднякоў падалі ў праўленьне калгасу заявы аб прыняцьці іх.

Таксама былі спатканы артыкул т. Сталіна і пастанова ЦК УсеКП(б) у в. Бялень. Рад беднякоў і сераднякоў адразу выказалі жаданьне ўступіць у калгас.

## Пробны выезд замацаваў калгас

### (Калгас імя 12-годзьдзя Кастрычніка)

29-га сакавіка калгас імя 12-цігодзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (вёска Праскуркі, Жлобінскага раёну) арганізаваў пробны выезд у поле.

Трэба адзначыць, што нядаўна з гэтага калгасу выступіла 30 гаспадарак. У калгасе засталося 52 гаспадаркі. Тлумачыцца гэта тым, што праўленьне калгасу да апошняга часу марудзіла з пераводам яго на новы статут с.-г. арцелі і амаль нічога не рабіла для арганізацыі працы ў калгасе.

Калі ў калгасе быў абмяркаваны новы статут і пачалося энэргічная падрыхтоўка да выхаду ў поле, сярод калгасьнікоў [illegible] рэзкі пералом. Выхад з калгасу спыніўся.

Праўленьне правяло добрую падрыхтоўчую работу да выхаду ў поле, разьмеркавала рабочую і цягавую сілу, вылучыла стаўшых брыгадзірамі. На агульным сходзе калгасьнікаў было абгаворана значэньне выхаду ў поле і плян яго арганізацыі. У вызначаны час усе калгасьнікі зьявіліся на работу. Перад самым выездам у поле ў калгас зьявіліся разам з коньмі 10 беднякоў і сераднякоў, якія нядаўна вышлі з калгасу і заявілі, што яны зноў варочаюцца назад у калгас і хочуць прымаць удзел у пробным выезьдзе.

Выезд паказаў, што ўвесь с.-г. інвэнтар, абруй, [illegible] у добрым стане. У часе выезду зрабілі першае заворванне на паўтары гадзіны зааралі 5 гэкт.

Пробны выезд зрабіў значны ўплыў, на тых сялян, якія яшчэ ня ўступілі ў калгас. Зараз, калі калгас замацаваны, рад беднякоў і сераднякоў рыхтуюцца падаць заявы аб уступленьні ў калгас.

Брыгадзір «Зьвязды» АПЯКІН.

## Калгасы Аршаншчыны слабо падрыхтаваны

### (Дзіўное распараджэньне Белкалгасцэнтру)

ВОРША. (Наш кар.). Генэральная праверка, распачатая па ініцыятыве «Зьвязды», выявіла, што рад калгасаў Аршаншчыны слаба падрыхтаваны да сяўбы. У акрузе лічыцца больш за 500 калгасаў, але значная частка іх яшчэ не замацаваны, яравы клін не адведзены. Рабочыя пляны складзены толькі ў 122 калгасах. Формы гэтых плянаў Белкалгасцэнтр мяняў некалькі раз. Зараз, калі ўжо пара пачынаць сяўбу, Белкалгасцэнтр зноў прапануе акркалгассаюзу складзеныя рабочыя пляны адмяніць, бо ўжо прыдумана новая іх форма, пры чым гэтую новую форму Белкалгасцэнтр абяцае з часам прыслаць.

С.-г. машынамі і прыладамі калгасы забясьпечаны невыстарчальна. Завоз шматкорпусных плугоў выкананы ў разьмеры 10 проц., барон «Зыг-заг» — 46 проц., арфаў — 21 проц. Культываторы, акучнікаў і гародных арфаў зусім не завезена. Замест 50 машына-конных станцый у калгасах арганізавана 19. Насеньне яшчэ таксама не завезена поўнасьцю, ільну - даўгунцу завезена толькі 50 проц. патрэбнага. Не кажучы аб цімафэйцы, лубяной таксама завезены ў вельмі нязначных колькасьцях. Зусім не завезены сораздзі, кукурузы і гатунконы ячмень. У некаторых раёнах у калгасах абагулены толькі 50 проц. пасеннага фонду, а ў іншых раёнах, як Аршанскі, Горацкі, Копыскі абагулены пасенны фонд складае 200 проц., бо ў калгасах яшчэ засталося насьнёвае тых сялян, якія выступілі з калгасаў.

Як ідзе перавод калгасаў на новы статут у акркалгассаюзе ня ведаюць. Абагуленьне рабочай жывёлы ў калгасах таксама чамусьці спынена. Рамонт с.-г. інвэнтару таксама ня скончаны.

Акркалгассаюз і райкалгассаюзы винны за гэты кароткі час мабілізаваць усе свае наўныя рэсурсы і сілы і дапамагчы калгасам выправіць паасобныя прарывы на пасеўным фронце.

М.

**Ад рэдакцыі:** Мы зварачаемся з запытаньнем да Белкалгасцэнтру, калі ён зьпранаваў Аршанскому калгасаю скасаваць складзеныя ў калгасах рабочыя пляны.

## Замест кіраўніцтва адыходніцтвам—самацёк

### Даклады прадстаўнікоў Калгасцэнтру БССР у Саюзным Калгасцэнтры

### (Ад нашага маскоўскага карэспандэнта)

У мінулым годзе Беларусь дала каля 160 тыс. сэзонных рабочых. А для бягучага году колькасьць сэзоньнікаў, якая на пляне прынадае на Беларусь, вылічваецца ў 250 тыс. чалавек. Калектыўны сэктар першапачаткова меркаваў паставіць 60 проц. усяго ліку адыходнікаў, г. зн. 150 тысяч рабочых. Але і з гэтай задачай беларускія арганізацыі спраўляюцца, на жаль, нездавальняюча. Гэта высьветлілася на ўчарайшым пасяджэньні пры Калгасцэнтры СССР. Даклады прадстаўнікоў Калгасцэнтру БССР тав. Аграноўскага і Магілеўскага (Гурэвіча) і Гомельскага (Барыкевіча) акруговых калгассаюзаў зрабілі ўвогуле нядобрае ўражаньне, якое прадстаўнік БСНГ СССР фармуляваў так:

**— Стаўка на арганізаваны адыход з калгасаў Беларусі бясспрэчна біта. Пляны кантрактацыі рабочай сілы сарваны. Адыходніцтва пойдзе шляхам самацёку.**

Такі вывад, калі нават прызнаць у ім некаторае згушчэньне фарбаў, грунтуецца на наступных фактах, паведамленых дакладчыкамі. На 30-га сакавіка ў беларускага Калгасцэнтру весткі аб адыходніцтве меліся толькі па двух акругах: **Магілеўскай і Менскай. Гомельская акруга ня можа даць вестак,** бо не атрымала ніякіх даных ад сваіх раёнаў. Іншыя 5 округ Беларусі нават і такой адніскі ня прыслалі свайму цэнтру, лічачы за лепшае маўчаць адносна свайго ўдзелу ў забесьпячэньні будаўніцтва рабочай сілай. Такое маўчаньне красамоўней, балай, гомельскага адказу. Афіцыйныя-ж даныя, якія мае Калгасцэнтр БССР, гавораць аб тым, што да пачатку красавіка беларускімі калгасамі вылучана: па Магілеўскай акрузе 5 тысяч адыходнікаў а 29.000 на пляне і па Менскай — 3.507 чал. з 18 тысяч, запраектаваных для округі. Як высьветлілася на нарадзе, Гомельская округа дала да сучаснага моманту — 2.398 адыходнікаў.

Ня гледзячы на надзвычай павольны разгортваньне адыходніцтва, Калгасцэнтр БССР, аднак, вызначае ўпэўнасьць, што ён з заданьнем поўнасьцю справіцца.

— Мы, зразумела, не гарантуем — з явіў прадстаўнік беларускага Калгасцэнтру — што дамо 100 тысяч адыходнікаў, але ўсё-ж суадносіны ліку адыходнікаў да агульнае колькасьці насельніцтва Беларусі і процант калектывізацыі дазваляюць думаць, што мы гэта абавязацельства выканаем.

Гэтае заўваленьне прадстаўніка Калгасцэнтру БССР было спаткана нарадзе з вялікім неданер'ем, бо яно разыходзіцца з фактычным станам рэчаў, якое паведамілі дакладчыкі. Арганізацыяй працы ў калгасах калгасцэнтр БССР пачаў займацца толькі са студзеня. У аргах апарат па арганізацыі працы з яшчэ знаходзіцца ў стадыі афармленьня, а ў раёнах ні калгасная сыстэма ні Наркамправы да сучаснага моманту свайго апарату па арганізацыі працы маюць. Вярбоўшчыкі Наркамправы людзі выпадковыя, яны ня ведаюць мясцовых умоў і яшчэ не ганьбуюць самі і ведамі «предсудительным» сродкамі для дасягненьня сваіх мэт.

Калгасцэнтр БССР, як гэта было даць з дакладу, не супярэчыў разгортаньню гэтай стыхіі, не кіраваў рухам. Наадварот, чуваючы кіраўніцтва, калгасцэнтры рыліся ў самацёк, які [illegible] лівыя формы дэтелізацыі адыходніцтва: самі арганізацыі ў арцелі, просяць калгасаў і мясцовых выканкомаў даць ім ліцэнзіі і адыходнікаў за ўладу на выезд і рыхтуюць. Нават на гэты страх і рызыку. Нават на гэты страх і рызыку, больш небясьпечны від самацёку, — ставіць пад пагрозу ўвесь плянавы ход з калгасаў. Калгасцэнтр Беларусі не зьвярнуў [illegible] увагі. Усе аспэктыўныя дырэктывы давяліся з прыкім спазьненьнем.

## Тэлеграмы

### Загад аб арышце Ен Сі-шана

ШАНХАЙ, 5. Нанкінскі ўрад выдаў дэкрэт аб звальненьні Ен Сі-шана з усіх займаемых ім пастоў. Адначасова выдан загад аб яго арышце.

### Амэрыка ўзбройвае Чан Кай-шы

**ЛЁНДАН, 6. Паводле вестак агенцтва Рэйтэра, нанкінскі ўрад купіў у ПАЗШ 12 самалётаў, прызначаных для ваенных дзеяньняў супроць Ен Сі-шана. (ТАСС).**

### Паўстаньне калёніяльных партугальскіх войск у Анголе

БЭРЛІН, 5. Паводле вестак з Лісабона, у Партугальскай калёніі Ангола (паўднёва-заходняя Афрыка) выбухнула паўстаньне партугальскіх калёніяльных войск. Агачом паўстаньня зьяўляецца гарнізон галоўнага гораду Анголы порт Лоанда. З прычыны строгай цэнзуры падрабязных вестак няма. Аднак, партугальскі ўрад прымушан быў пацьвердзіць паведамленьне аб паўстаньні і аб тым, што яно выклікае непакой. Для задушэньня паўстаньня з Партуганіі ў Анголу адпраўляецца спэцыяльны ваенны транспарт.

### Забастоўка батракоў у Данцыгу

**КРЫВАВАЯ СУТЫЧКА ЗАБАСТОЎШЧЫКАЎ З ЖАНДАРМЭРЫЯЙ**

ДАНЦЫГ, 2. У трох с.-г. округах тэрыторыі вольнага гораду Данцыгу пачалася забастоўка с.-г. рабочых. Забастоўка абвешчана паводле пастановы канфэрэнцыі рэвалюцыйна-апазыцыйнага крыла прафсаюзу с.-г. рабочых, якая адбылася гэтымі днямі. Забастоўка праходзіць пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі. Бастуючыя высоўваюць эканамічныя патрабаваньні. Забастоўка мае масавы характар. Ва ўсіх вёсках разьмешчаны моцныя атрады паліцыі.

ДАНЦЫГ, 3. Забастоўка батракоў у 3-х с.-г. округах вольнага гораду Данцыгу працягваецца. Учора ў паселішчы Шэгэне (у 

# Па Савецкім Саюзе

## ЗАСЕЯЛІ ЗВЫШ ПЛЯНУ

ПІРЗУЛА. зо сакавіка Малдаўская рэспубліка закончыла сяўбу збожжавых культур. **Засеўныя плошчы перавыкананы.** Уся зямля засеяна. Засеяна значная плошча наперад.

Па ўсёй рэспубліцы калгасы выяўлялі на работу вусім арганізавана. Заняволеныя калгасы і сёлы прыступілі да засеву і пасадкі агародных культур. Масавую сяўбу некаторых агародных культур затрымліваюць наступныя ў апошнія дні халады.

Культура ўсямерна прабавала перабудаваць арганізаванай сяўбе. У некаторых сёлах кулакі вялі актыўную работу супроць калектывізацыі і сяўбы. Кулакі ужывалі нават падпал калгаснае маёмасці. Так, у сяле Карэшкты кулак Мазелька падпаліў калгасную стайню, дзе 6 коней. У падпале прымалі ўдзел чатыры кулакі. Усе яны арыштаваны.

Ход сяўбы ішло і ідзе ўзмоцненае тэмпе. Аднак, кулак ня хоча посьпеху. Беднага і серадняка даюць яму належны адпор.

Цімыя засевы у Малдаўскай рэспубліцы і ў Адэскай акрузе вельмі добрыя. Мінулым годзе тут загінула значная частка пшаніцы, а у гэтым годзе не пасаджаны ні адзін гектар.

НОВАРАСІЙСК, 3. Сяўба збожжавых у акрузе ў асноўным закончана. У пшасаці калгасы плян сяўбы перавыкананы. Так, **калгасы Новарасійскага раёну перавыканалі плян на 20 проц.**

СЭВАСТОПАЛЬ, 3. **У Сэвастопальскім** акрузе закончылася сяўба ярыны. **Плян перавышаны на 24 проц.**

РАСТОЎ-ДОН, 3. На 3-га красавіка калгасы, калгасы і індывідуальныя гаспадаркі краю засеялі розными яравымі культурамі 1.837.000 гэктар, або 21,3 проц. усяго яравога кліну, у тым ліку збожжавымі засеяна 1.732.000 гэкт. (49,3 проц. намечанага пляну). Надвор'е мінулай дэкады зусім спрыяла сяўбе.

На поўдні сяўба збожжавых культур працягваецца, мясцамі (напрыклад, у частцы Стаўропалю) закончана. Пачалася сяўба слоначнікаў і кукурузы. Дажджы, якія ідуць цяпер, часткова затрымліваюць тэмп сяўбы. Пачалося ўшчэнне азімых. Стан іх вышэй сярэдняга, а мясцамі дасканалы.

ХАРКАЎ. **На Украіне** засеяна 1.900.000 гэкт.: калгасамі — 1,6 млн. (15 проц. пляну), індывідуальнымі гаспадаркамі— 302 тысячы гэкт. (4 з паловай проц.).

РАСТОЎ-ДОН, 3. На 1-га красавіка збожжавы **саўгас «Гігант»** заараў, апрацаваў і засеяў амаль палову вызначанай плошчы. На палёх у калгасах працуюць трактары яшчэ 9 іншых збожжавых саўгасаў.

САРАТАЎ. У рэспубліцы немцаў Паволжа дрэнна арганізавана сяўба ў індывідуальных гаспадарках. У тых кантонах, дзе сяўба ўжо пачалася, ня ўсюды індывідуальным гаспадаркам адведзены землі.

Атрыманыя рэспублікай з Астрахані 18 тысяч цэнтнэраў насеньня пшаніцы аказаліся напалову цьвёрдай, напалову мяккай пароды, рознай усхожасьці з прымешкай 10 проц. сьмецьця. Гэтым насеньнем трэба засеяць 25 тысяч гэкт. Пачата сьледзтва для выяўленьня вінаватых у прысылцы недобраякаснай пшаніцы.

БРАНСК. Бранскае земельнае кіраўніцтва не сьпяшаецца з падрыхтоўкай да сяўбы. Да гэтага часу не праведзена ніякай работы сярод 100 тысяч індывідуальных гаспадарак.

# АНТЫСАВЕЦКІЯ МАХІНАЦЫІ ПОЛЬСКІХ МІЛІТАРЫСТЫХ

Падрыхтоўка да вайны з СССР у Польшчы прыняла такі ўзгражаючы характар, што прадстаўнікі панскай часткі грамадзкасьці, якія баяцца рызыкаваць сваёй авантуры, палічылі патрэбным выступіць у сойме з запытаньнем, чаму польскі ўрад ня прыняў міралюбівых прапоў савецкага ўраду аб заключэньні дагавору аб пенадзе. З такімі запытаньнямі ў сойме выступілі бурзныя правыя: Пілсудскага, дэпутаты **Стронскі, Домбскі і Грэпінскі.** Адказ ад ураду ня было. Гэта маўчаньне вельмі характэрна. Мала таго,— больш, чым красамоўнае. Маўчаньне ураду Пілсудскага на такім важным пытаньні роўнаважна пагрозе супраць савецкага, дэпутаты ўсю савецкую грамадзкасьць.

Як вядома, палітычнай аксёмай польскіх фашыстых зьяўляецца сьцьвярджэньне, што для паляхоўсьці іх адносінах з Нямеччынай. Адходна паразуменьне — [illegible] назад гэтае паразуменьне было дасягнута: фашысцкім урадам Польшчы заключыў з сацыялістскім урадам Нямеччыны так званы «ліквідацыйны дагавор», які **ім дазам накіраваны супроць СССР.** Зьвязваючы сабе руки на Захадзе, дзкая дыпляматыя прагніла жвавасьць на Ўсходзе, у прыватнасьці ў Прыбалтыцы. У лістападзе 1929 году Гэдзко (заг. міністэрства замежных спраў) адбыў **ваякую прагулку»** па ўсіх прыбалтыйскіх краёх, а адзінай, нібыта, мэтаю знаёмідца з работай польскіх дыпляматычных місій у гэтых краёх. Праз некаторы час пасля гэтай «прагулкі» кіраўнік эстонскай рэспублікі Грандман прыехаў з Варшавы, каб на дарозе ў Польшчы Літва, якую варожая Польшчы Літва шуць сваёй сталіцаю, акупаванай панамі.

Кіраўнаўча пядаўна, у часе апошняга абвастрэньня крызісу ў Францыі, закаўрадавага крызісу ў Крымавага і ны прыняць Міхалая Пуанкарэ — ступіў са сваім галосам артыкулам «чорных крокаў» на польска-савецкіх мяжы і аб «савецкіх інтрыгах» у Прыбалтыцы.

Дзеўчаце часьля гэтага ў Прыбалтыку накіроўваецца начальнік разведвацтва адзяленьня генштабу палкоўнік Пэлчынскі. Адначасова на прамільнуты паведамленьне аб пе[illegible]кім **таямнічым зьездзе ваенных аташэ ў Гэльсінгфорсе.**

У той-жа час у Варшаву раптоўна з'ехджае польскі пасланьнік у Маскве Ян разам з ваяковым аташэ Кавальскім. У Варшаве пачынаюцца чуткі, што яны прыбылі на нейкую рашаючую нараду на пытаньні аб савецка-польскіх адносінах.

Пасланьнік Патэк, які, здавалася-б, бачнен быў імкнуцца да ўмірацтваньня польска - савецкіх адносін, лічыць магчымым прыступіцаць разам з міністрам замежных спраў Залескім на лекцыі, наладжаныя у Варшаве вядомым ангельска - францускім шпіёнам Кудэнговэ - Калергі, які **заклікае да ўзброенай інтэрвэнцыі ў СССР.**

Пасьля свайго выступленьня ў Варшаве, Кудэнговэ - Калергі накіроўваецца ўсьлед за Голувко і Пэлчынскім у... Прыбалтыку. Гэтымі днямі гэты англёфранцускі разьведчык выступаў з чарговым антысавецкім дакладам у Рэвэлі.

Ня трэба пры гэтым забываць, што ўсе гэтыя факты адбываюцца на фоне жорсткай антысавецкай кампаніі ва ўсім капіталістычным сьвеце, на фоне: «бесядоўчыны», «куцепаўшчыны» і «крыжовага паходу».

Але гэта яшчэ ня ўсё. Паводле вестак польскага друку, урад (нібыта жадаючы зьмякчыць эканамічны крызіс) перадаў прамысловасьці буйныя ваенныя заказы, прычым ужо ў гэтым годзе будуць на гэта выдаткаваны сумы, **прызначаныя на 1931 і 1932 г.г.** Між іншым, **Лодзь атрымала ваенны заказ звыш 3 з палов. млн. матраў папяровых тканін, коштам ў 5 млн. злотых.**

Адначасова праводзіцца новая ўзмоцненая чыстка афіцэрскага корпусу ад элемэнтаў, недастаткова лёяльных ў адносінах да Пілсудскага.

Характэрны таксама ўльтыматум, прад'яўлены Пілсудскім сойму. Пілсудскі патрабуе, каб сойм сам сябе ліквідаваў і, у прыватнасьці, каб ён даў яму права бескантрольна выдаткоўваць народныя грошы. На якія сакрэтныя мэты будуць выдаткаваны гэтыя грошы?

І, урэшце, самае сэнсацыйнае паведамленьне: **19 сакавіка было апублікавана распараджэньне Пілсудскага аб устанаўленьні пасады генэральнага грамадзянскага камісара пры стаўцы галоўнакамандуючага польскай арміяй.** У гэтым распараджэньні пералічваюцца правы і абавязкі гэтага грамадзянскага камісара. **Яго роля зводзіцца па сутнасьці да кіраўніцтва адміністрацыйным апаратам на тэрыторыях, якія (як спадзяюцца польскія мілітарыстыя) будуць імі акупаваны ў часе вайны.** Насельніцтва Заходняй Беларусі да гэтага часу памятае крывавы рэжым генэральнага грамадзянскага камісара (у 1919-1920 г.г.) Асмалоўскага, які чыніў суд і расправу над беларускімі рабочымі і сялянамі. І вось зараз здань 1919-1920 г.-г. ажывае.

Але і гэтага яшчэ ня ўсё. Распараджэньне Пілсудскага ад 19 сакавіка патрабуе, каб **кандыдатура на пасаду грамадзянскага камісара была вызначана... ужо зараз. Таксама павінны быць вызначаны ўжо зараз кандыдатуры на ўсе пасады ў канцылярыі генэральнага грамадзянскага камісара.**

Вось некалькі фактаў, якія гавораць **аб тэй сапраўднай гарачцы, з якой польскі фашызм рыхтуецца да вайны з СССР.**

А. П.

*Партыйнае будаўніцтва*

# Хутка і рашуча выправіць перагібы і скрыўленьні

**„Асаблівасьць перажываемага моманту заключаецца ў тым, што барацьба з памылкамі „левых" загібшчыкаў зьяўляецца ў нас умовай і своеасаблівай формай пасьпяховай барацьбы з правым апартунізмам" (І. СТАЛІН)**

## *** Грэскі урок ***

Тое, што адбылося ў **Грэскай** партарганізацыі, заслугоўвае самае сур'ёзнае ўвагі. Грэскія справы добра паказваюць, куды вядуць грубейшыя скрыўленьні дырэктыў партыі, «левыя» перагібы і праваапартуністычная недаацэнка і ігнараваньне работы сярод батрацтва і беднаты.

Пры правядзеньні калектывізацыі ў Грэскім раёне былі дапушчаны абураючыя скрыўленьні партыйнай лініі. Пагрозы і адміністраваньне, раскулачваньне сераднякоў і беднякоў, сыстэма байкоту і рэпрэсіі у адносінах да сялян, якія ня ўступілі ў калгасы, ігнараваньне работы сярод батрацтва і беднаты складалі арсэнал мэтадаў і дзеяньняў грэскіх гора - калектывізатараў.

Бюро РК, на чале з сакратаром, нарашыла ва што-б там ні стала не адставаць ад другіх раёнаў. «Мы ўсё можам, нам усё нішчым». Бюро РК катэгарычна прапанавала ўсім ячэйкам дабіцца 100-процантнай калектывізацыі раёну да канца 1930 году. У раёне дзейнічаў неафіцыйны загад: «Не адставаць ад Капыля» (суседні раён суцэльнае калектывізацыі). Ня трацячы часу, раённыя работнікі заўзята прыняліся за «работу». Аб тым, як **райком ажыццяўляў** на практыцы свае дырэктывы, лепш за ўсё сьведчыць наступны факт.

Члены бюро райкому **Сьмірноў** на раённым зьезьдзе калгаснікаў правёў пастанову:

«Усіх сялян, якія ня ўступілі ў калгасы, падзяліць зямлёю горшай якасьці па 1-2 гэктары».

За гэтай першай галавацяпскай, унцер - прышыбееўскай пастановай, якая ў корані скрыўляе дырэктывы партыі, пасьледавала сыстэма грубейшых перагібаў і скажэньняў, дапушчаных у раёне. Замест растлумачальнай работы сярод батрацтва і беднаты, грэскія «калектывізатары» практыкавалі пагрозы арыштам і высылкай на Салаўкі, пазбаўленьне выбарчых правоў у адносінах да беднякоў і сераднякоў, якія ня ўступілі калгасы і г. д., і г. д. Замест рашучага змаганьня з супраціўленьнем кулака, раённыя «правадыры», на выгаду кулацтву, абмежаваліся адміністрацыйным авантурніцкім «раскулачваньнем» асобных сераднякоў і нават беднякоў.

У Грэскім сельсавеце беднякі і сераднякі, якія ня ўступілі ў калектывы, пазбаўляліся права голасу. У радзе вёсак беднаце, не ўступіўшай у калгасы, была спынена выдача хлеба і продаж неабходных прадуктаў спажываньня (газы, солі і г. д.). У вёсках Русакі і Аксаміты работнікі райкому складалі два сьпісы: у адзін запісваліся сяляне - калгаснікі, а ў другі заносіліся беднякі і сераднякі, якія ня ўступілі ў калгасы, для... «высылкі на Салаўкі». Сакратар Першамайскай парт'ячэйкі Тарасэвіч так растлумачваў сялянам сутнасьць калектывізацыі.

«Кожны бядняк і серадняк павінен быць у калгасе. Хто ня ўступіць, той будзе арыштаваны...»

Грэскія унцер - прышыбеевы ў сваім галавацяпстве дакаціліся да яўна контр - рэвалюцыйных мэтадаў, якія былі на руку клясавым ворагам. Член бюро райкому партыі **Сьмірноў** і член бюро райкому камсамолу **Аўсяньнінаў,** разам з **Грозайскай** ячэйкай абвясьцілі байкот вёскам **Дубейкі і Пуцава.** Падставы для байкоту былі простыя. Дубейскія і цукаўскія беднякі і сераднякі, нічога ня ведаючы аб сутнасьці калектывізацыі, адмовіліся ўступіць у калектывы. Грозаўскія-ж «партыйцы», на чале з Сьмірновым і Аўсяньнікавым, палец аб палец ня стукнулі, каб растлумачыць сялянам выгаду калектыўнай гаспадаркі. Замест гэтага, галавацяпы абвясьцілі байкот вясковай беднаце і серадняком, штурхнуўшы іх у абнімкі кулака.

Ці варта гаварыць, што ў раёне работа з беднатой пастаўлена вельмі кепска? З 38-мі калгасаў толькі ў 13-ці арганізаваны батрацка - бядняцкія групы. Але большасьць груп беднаты фактычна не працуе. Частка камуністых у пытаньнях работы сярод беднаты спаўзала на яўна праваапартуністычныя пазыцыі, адкрыта выступаючы супроць дырэктыў партыі. У Грэскай арганізацыі ёсьць такія партыйцы, якія заяўляюць: «Даволі пацкацца з беднатой, ня трэба сярод гэтай галоты праводзіць работы». Парт'ячэйка саўгасу **Пакрашыва** адмаўляецца праводзіць работу з батракамі і беднатой. Бюро РК лічыла такія фактыз вычайнай зьявай. Гэта ня дзіўна. Правыя апартуністы з бюро райкому з свайго боку груба ігнаравалі работу сярод батрацка - бядняцкіх мас. Член бюро РК **Біруля,** атрымаўшы згоду членаў бюро райкому **Уласэвіча і Купрыянава,** беспадстаўна заводзіць судовую справу супроць бедняка. Сваім абгарытэтам Біруля прымусіў нарсуд засудзіць бедняка быццам-бы за «зьнявагу».

Раскулачваючы беднякоў і сераднякоў, грэскія галавацяпы ў радзе вёсак «пашкадавалі» кулака. У **Старыцкім** сельсавеце пры раскулачваньні ў аднаго кулака забралі адну карову і 4 вазы канюшыны, а пакінулі яму 2 каровы і 3 коцяй. У другога кулака было забрана цялё, а пакінуты 2 каровы і 3 кані. Гэта яшчэ ня ўсё. У Грэскім раёне раённыя работнікі дадумаліся да ліквідацыі местачковай «буржуазіі». У мястэчку Грозаве былі «раскулачаны» мясцовыя беднякі-«лішэнцы». Між іншым, у Грозаве раскулачваліся ня толькі «лішэнцы», але і наогул местачковая беднота.

Да чаго прыяла такая «палітыка» раённага партыкіраўніцтва? Якія вынікі прынесьлі галавацяпства і злачынныя перагібы, меўшыя месца ў раёне? У адказ паламо некалькі лічбаў. Калгаснае будаўніцтва ў раёне згортваецца, частка калгасаў распалася. З 62-х калгасаў на 1 красавіка засталося толькі 38. Калектывізаваная плошча з 65 проц. зьменшылася да 17. Калгасы да сяўбы не падрыхтаваны. У наяўнасьці рэальная пагроза поўнага зрыву веснавой сяўбы.

Як-жа рэагавала бюро райкому на гэтыя факты, як яно змагалася са злачыннымі / скажэньнямі, якія практыкаваліся ў раёне? Аб гэтым ня варта гаварыць, бо сам сакратар РК **Уласэвіч абедзьвюма рукамі галасаваў за прымусовую «калектывізацыю».** Сакратар РК **нават пасьля апублікаваньня артыкулу тав. Сталіна і новага статуту с.г. арцелі, на нарадзе зямляўпарадчыкаў даў устаноўку, што «усё-ж такі калектывізацыю трэба праводзіць прымусова».**

Пры такім кіраўніцтве зразумелай становіцца сыстэма перагібаў і скажэньняў і ўнцер-прышыбееўскай практыкі, існаваўшая ў раёне. Сакратар РК не інфармаваў Менскі акругком партыі аб сапраўдным стане раёну Уласэвіч нахабна хлусіў у акруткоме ад тым, што ў Грэску ўсё добра, займаючыся злачынным «очковтирательством».

Самакрытыка ў Грэску адсутнічае. Сакратар РК рэагаваў на кожнае выступленьне, якое яму не падабалася,

**Лельчыцкі райком распушчаны**

Бюро **Мазырскага** АК КП(б)Б заслухала даклад аб рабоце **Лельчыцкай** раённай партарганізацыі. Бюро адзначыла паяўнасьць буйных праваапартуністычных памылак і «левых» загібаў у рабоце партарганізацыі. Райком ня здолеў праводзіць генэральную лінію партыі. Кіраўніцтва партарганізацыі няправільна арыентавала партыйныя масы па радзе асноўных пытаньняў палітыкі парыті. Пры правядзеньні калектывізацыі ў Лельчыцкім раёне былі дапушчаны грубейшыя перагібы і скрыўленьні партыйнай лініі.

Бюро АК **распусьціла ўвесь склад Лельчыцкага раённага камітэту** партыі. Усе кіраўнічыя работнікі раёну **зьняты** з пасад. Бюро Мазырскага АК заваструе ўвагу Лельчыцкай арганізацыі на патрэбе рашуча выправіць дапушчаныя памылкі і перагібы і разгарнуць калгаснае будаўніцтва ў раёне на аснове дырэктыў партыі.

**Урокі Шклова ня ўлічаны**

Рэдакцыя **«Зьвязды»** ўчора атрымала паведамленьне з **Магілева** аб тым, што на раённым сходзе **Чэрыкаўскай** арганізацыі КП(б)Б, пасьля абмеркаваньня артыкулу тав. **Сталіна «Головокружение от успехов»,** была ўхвалена антыпартыйная пастанова, па сутнасьці накіравная супроць лініі партыі. Падаем поўны зьмест гэтае пастановы:

**«Райпартсход лічыць, што артыкул т. Сталіна, які зьмешчан у газэце «Правда», ад 2-га сакавіка, у прынцыпе правільны (!) і больш мэтазгодна было-б, калі-б апошні быў не надрукаваны ў газэце, а ў сакрэтным парадку разасланы па райпартарганізацыях для выпраўленьня, што такім чынам яго не скарысталі-б варожыя нам элемэнты, як яно маецца на справе».**

Зусім відавочна, што гэта пастанова нічога агульнага ня мае з лініяй нашай партыі і зьяўляецца адкрытым пратэстам супроць дырэктыў партыі аб выпраўленьні скажэньняў партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве.

**«Камунар Магілеўшчыны»** ў сваім перадавым артыкуле ў № 41 па гэтым пытаньні піша наступнае:

«Для нас зусім ясна, што Чэрыкаўскае партыйнае кіраўніцтва збанкрутавала, што яно нездольна на даным этапе праводзіць генэральную лінію партыі».

«Камунар Магілеўшчыны» ў гэтымжа артыкуле падае рад фактаў, якія сьведчаць аб тым, што кіраўніцтва Чэрыкаўскай партарганізацыі не жадае выпраўляць дапушчаных памылак.

Антыпартыйная пастанова Чэрыкаўскага райпартсходу сыгналізуе аб тым, што ўрокі Шклова ня ўлічаны. Гэты факт заслугоўвае самае сур'ёзнае ўвагі ўсіх партыйных арганізацый.

Рэдакцыя падкрэсьлівае антыпартыйны, палітычна-шкодны характар пастановы Чэрыкаўскага райпартсходу, накіраванай супроць лініі партыі. У наступных нумарох «Зьвязды» рэдакцыя дакладна зьвернецца да гэтай справы.

# Да партыйнай нарады па рабоце на транспарце

## Некаторыя задачы парткіраўніцтва на транспарце

Яшчэ 15-ты зьезд партыі адзначыў спозьненасьць транспарту з пераходам да карэннай рэканструкцыі, а лістападаўскі пленум ЦК падкрэсьліў, што транспарт усё зьяўляецца вузкім месцам. І да гэтага часу транспарт не перастроіўся.

Вынікі апошняга паўгодзьдзя выразна гавораць аб тым, што за апошні год быў выкрыт рад прарываў у рабоце буйнейшых вузлоў Беларусі, як Ворша, Гомель, Віцебск і Менск. Гэтыя прарывы толькі ілюстравалі тое нездавальняючае становішча, якое мы маем на транспарце. Перад намі вострa паўсталі пытаньні карэннай перабудовы ўсёй сыстэмы кіраўніцтва на транспарце.

Партыйныя арганізацыі Беларусі на мясцох вельмі слаба кіравалі работай на транспарце. Асноўная прычына такога становішча знаходзілася не ў недаацэнцы значэньня чыгуначнага транспарту, а ў тэй «экстэрытарыяльнасьці», якая часамі адрывала чыгуначную гаспадарку і чыгуначныя арганізацыі ад мясцовых арганізацый.

Іменна гэтыя адарванасьць і слабасьць кіраўніцтва мясцовых партарганізацый работай чыгункі і зьяўляюцца адной з асноўнейшых прычын спазьненьня з пераходам да карэннай рэканструкцыі чыгункі.

Другой прычынай слабога тэмпу сацыялістычнай рэканструкцыі чыгункі зьяўляецца тое супраціўленьне клясавароўскіх элемэнтаў, якія ёсьць у апараце транспарту. Стары апарат транспарту менш за ўсё пацярпеў ад рэвалюцыі. Старога ў апараце транспарту ёсьць значна больш, чым у іншых апаратах нашых устаноў. Кансэрватызму, бюракратызму і кіслага патрыятызму ў апараце транспарту вельмі многа. Асноўным недахопам партыйных, прафэсіянальных і іншых арганізацый на чыгунцы зьяўляецца тое, што яны не даволі скарыстоўвалі магутны ўздым актыўнасьці, шырокі размах творчых памаганьняў рабочых чыгункі (сацспаборніцтва, ударніцтва) для паскарэньня ўсіх працэсаў сацыялістычнай рэканструкцыі на транспарце. Шматлікія выпадкі заціску самакрытыкі, невыстарчальная дзейнасьць самакрытыкі і цэлы рад іншых недахопаў і часамі праваапартуністычных памылак, якія мелі месца на многіх вучастках чыгункі, — лепш за ўсё характарызуюць няўменьне раду чыгуначных ячэек стаць на чале перабудовы транспарту.

Ня ставячы перад сабой задачы гаварыць аб усіх задачах партыі на чыгунцы, мы ніжэй зазначым на некаторыя новыя задачы, якія паўсталі перад намі ў галіне паляпшэньня настаноўкі работы на транспарце і кіраўніцтва самім транспартам.

Апублікаванае новае палажэньне аб сыстэме кіраўніцтва на транспарце зьяўляецца пачаткам карэннай рэарганізацыі ўсёй работы на транспарце. У узгадненасьці транспарту з арганізацыямі абслугоўванага імі раёну ўстаноўлены больш выразныя. Па новым палажэньні кіраўніцтва транспартам значна дацэнтралізавана. Станцыя, раённае кіраўніцтва, праўленьне дарогі на чале з дырэктарам, НКШЗ — вось тыя чатыры асноўныя зьвенні, якія адлюстраваны ў новым палажэньні. Станцыя, раённае кіраўніцтва, рад іншых адзінак пераводзяцца на гаспадарчы разрахунак. Яны будуць мець свой прамфінплян. Па ўмовах сваёй работы чыгуначныя ячэйкі цяпер яшчэ больш наблізіліся да ўмоў работы іншых прадпрыемстваў. Перад кожнай чыгуначнай ячэйкі цяпер стаіць ва ўсёй сваёй шырыні задача забясьпячэньня і выкананьня прамфінпляну. Тут ужо нельга адгаворвацца адсутнасьцю магчымасьці праявіць ініцыятыву з-за празьмернай цэнтралізацыі.

Ращуча вымяняецца роля і значэньне нашых рэспубліканскіх, акруговых і раённых партыйных арганізацый у галіне кіраўніцтва чыгуначным транспартам.

Цяпер ёсьць поўная магчымасьць кіраваць асноўнымі гаспадарчымі адзінкамі чыгуначнага транспарту, у першую чаргу станцыяй і раённым кіраўніцтвам. Адказнасьць мясцовых арганізацый узрасла, кіраўніцтва чыгуначным транспартам павінна ажыццяўляцца таксама, як іншым напрам трэстам ці гаспадарчай адзінкай. Сувязь паміж усімі нашымі арганізацыямі і транспартам павінна значна ўзмацніцца. Праводзіць прамфінплян пасапраўднаму кіраўнік транспарту здолее толькі тады, калі ён будзе апірацца на ўсю сілу нашых арганізацый.

Неабходна правядзеньне яшчэ аднаго буйнога мерапрыемства для ліквідацыі таго адрыву, які мы маем цяпер у галіне абслугоўваньня матар'яльных і культурна - бытавых запатрабаваньняў рабочых - чыгуначнікаў.

Трэба ліквідаваць самастойную сыстэму транспартнай каапэрацыі, аховы здароўя, народнай асьветы, сацыяльнага страхаваньня. У сувязі з гэтым перад нашымі партарганізацыямі стаяць наступныя задачы: хутчэй ліквідаваць усе шкодныя перажыткі пазасы «отчуждения». Трэба адказнасьць пьвёрда забясьпечыць, каб абслугоўваньне чыгуначнікаў ні ў якім выпадку не пагоршылася ў сувязі з гэтай рэарганізацыяй, трэба памятаць, што наша адказнасьць за матар'яльнае становішча і культурна-бытавое абслугоўваньне чыгуначнікаў павялічваецца ў шмат раз. І гэта павінна быць абавязкова ўлічана пры распрацоўцы адпаведных плянаў і мерапрыемстваў.

Рэарганізацыя сустрэне пры сваім ажыццяўленьні цэлы рад перашкод. У сувязі з гэтым перад намі стаіць задача — мабілізаваць саміх чыгуначнікаў для хутчэйшага ажыццяўленьня вышэйказаных мерапрыемстваў. Трэба, каб усе чыгуначнікі ведалі пляны рэарганізацыі, каб партыйнае і камсамольскае арганізацыі мерапрыемстваў прапрацавалі ўсе пытаньні, зьвязаныя з гэтай рэарганізацыяй. Трэба вылучыць брыгады для дапамогі правядзеньню гэтых мерапрыемстваў. Наступнай асноўнай задачай партарганізацый у галіне паляпшэньня работы транспарту зьяўляецца ращучае паляпшэньне апарату і ўзмацненьне кіраўнічых кадраў транспарту рабочымі. Бяз гэтага ўся рэарганізацыя можа затармазіцца і дзе-ні-дзе сарваца. У гэтай галіне перад намі стаяць наступныя задачы: падрыхтаваць да чысткі ўсяго апарату транспарту ад шкодніцкіх, клясава - варожых і нягодных элемэнтаў. Трэба рэзка павялічыць вылучэньне рабочых на кіруючую работу в такім разьлікам, каб у працягу году падвоіць пралетарскую праслойку ў кіруючых кадрах. Тэмп рэалізацыі дырэктыў лістападаўскага пленуму ЦК аб кадрах нездавальняючы. Апарат таго процант рабочых в вялікім вытворчым стажам, ужо загартаваных на вытворчасьці сярод пасланых на розныя курсы — невыстарчальны і яго трэба таксама павялічыць. Пытаньні кадраў для чыгуначнага транспарту павінны стаць у цэнтры ўвагі ўсіх партыйных арганізацый Беларусі.

Рабочыя - чыгуначнікі выкінулі лёзунг — ажыццявіць пяцігодку за 3 гады. Адным з сур'ёзнейшых мерапрыемстваў для забясьпячэньня выкананьня гэтага заданьня зьяўляецца поўнае правядзеньне дырэктыў аб адзінаначаллі. Бадай, дзіўна, але на чыгуначным транспарце прынцыпы адзінаначальля парушаліся часьцей за ўсё і больш за ўсё. Усе парушэньні ў прынцыпе адзінаначальля павінны быць асуджаны самым суровым чынам.

Мы гаворым толькі аб рабоце партыйных арганізацый. Зусім натуральна, што задачы беларускіх прафарганізацый — ЦСПСБ, акрпрафбюро і беларускага бюро ЦК чыгуначнікаў — таксама значна ўскладняюцца. Прафарганізацыі павінны шчыльна падысьці да пытаньняў садзейнасьці сацыялістычнай рэканструкцыі чыгуначнага транспарту, матар'яльнага і культурнага абслугоўваньня чыгуначнікаў. Кіраўніцтва прафарганізацыямі чыгуначнікаў з боку ЦСПСБ і акрпрафбюро павінна быць значна ўзмоцнена.

Трэба ўзмацніць кантроль рабочых над усёй работай чыгуначнага транспарту, трэба разгарнуць рабочае шэфства над установамі чыгуначнага транспарту. Рабочы БССР павінен лепш ведаць чыгуначную гаспадарку і больш ёй дапамагаць. Рабочы - чыгуначнік павінен прымаць больш актыўны ўдзел у рабоце агульных пралетарскіх арганізацый Савецкай Беларусі.

Асноўным мерапрыемствам, якое забясьпечвае мабілізацыю рабочых наваколь пытаньня сацыялістычнай рэканструкцыі чыгункі, зьяўляецца максымальнае разгортваньне самакрытыкі, бязьлітаснае змаганьне з усімі тымі, хто заціскае самакрытыку. Справіцца з гэтымі задачамі мы зможам толькі тады, калі ўся партарганізацыя цалкам, і ў першую чаргу чыгуначныя ячэйкі, яшчэ больш узмоцняць сваё змаганьне з усімі скажэньнямі лініі партыі, як з правым ухілам, найбольш небясьпечным, так і з «левымі» загібамі ў рабоце ўсіх транспартных арганізацый.

А. ТАНХІЛЕВІЧ.

**Далі адпор трацкісцкай вылазцы**

Пры абмеркаваньні дакладу аб калгасным будаўніцтве на адкрытым партыйным сходзе прадпрыемстваў **БДВ** мела месца контр-рэвалюцыйнае, трацкісцкае выступленьне з боку трацкістага Мар'ясіна.

Мар'ясін выступіў з цэлай «тэорыяй» супроць генэральнай лініі партыі. Ён сказаў, «што лёзунг Сталіна (Сталіна, а ня партыі) аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, не адпавядае расстаноўцы клясавых сіл у краі».

«Сталін—кажа далей Мар'ясін—кінуў лёзунг аб ліквідацыі кулацтва, не запытаўшыся ў партыі, што наогул ня партыя кіруе, а Сталін і апарат» і г. д., і г. д.

Вось у асноўным зьмест паклёпніцкага, варожага выступленьня трацкістага Мар'ясіна. Кожны больш-менш сьвядомы рабочы добра зразумеў контр-рэвалюцыйны характар і зьмест гэтага выступленьня. Гэта была чарговая спроба трацкістага Мар'ясіна кампрамэтаваць правадыроў партыі, усю партыю, спроба паслабіць наша наступленьне на клясавага ворага, на кулака, на ўсе варожыя элемэнты ў нашай краіне, спроба паслабіць барацьбу з правымі і «левымі» апартуністымі, з рэшткамі трацкізму.

Нашы посьпехі ў галіне рэканструкцыі народнае гаспадаркі, творчы ўздым рабочае клясы, разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарнага руху, вялізарны аўтарытэт партыі, якія выявіліся ў масавым уступленьні перадавых рабочых - ударнікаў у рады УсеКП(б), практычнае ажыццяўленьне лёзунгу ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі—дапучэнту разьбіваюць усю агіднейшую хлусьню мар'ясіных на партыю.

Мар'ясін чакаў, што сярод некаторых камуністых, або рабочых-друкароў, ён спаткае падтрыманьне. Але ён памыліўся. Камуністыя і беспартыйныя рабочыя - друкары далі аднадушны рашучы адпор Мар'ясіну, належным чынам ацанілі контр-рэвалюцыйнае выступленьне трацкістага.

Агульны сход даручыў бюро партыйнага калектыву **ўзмацніць** сваю работу па дапамозе калектывізацыі вёскі і ў правядзеньні бальшавіцкай сяўбы.

Р.

*Да партнарады па народнай асьвеце*

# Аб сыстэме народнай асьветы ў БССР

Дыскусія аб сыстэме народнай асьветы пачалася ўжо з 1919 году, але, на вялікі жаль, да гэтага часу ўдасканаленьне сыстэмы па ўсім Савецкім Саюзе ня вырашана. Кожная Савецкая рэспубліка мае сваю сыстэму, ці, вярней кажучы, ня мае сыстэмы, якая-б зусім магла задаволіць нашы асабліва сучасныя запатрабаваньні.

Мы зараз у гаспадарчым будаўніцтве падыходзім шчыльна да адзінага пляну сацыялістычнага будаўніцтва, мы ўжо даводзім пляніраваньне да раёну, фабрыкі, заводу, а гэта ў сваю чаргу ставіць перад намі задачу адзінага пляну культурнага будаўніцтва, якіг-б адпавядаў сучасным задачам рэканструкцыйнага пэрыяду. У першую чаргу нам патрэбна адзіная сыстэма народнае асьветы.

Пастановаю лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) пытаньне вышэйшай школы ў асноўным вырашана, зараз трэба толькі практычна ажыццёвіць гэту пастанову. Пытаньне-ж сярэдняй школы да гэтага часу ў нас яшчэ вельмі заблытана і асноўныя спрэчкі паміж розными саюзнымі рэспублікамі ідуць аб сярэдняй школе (тэхнікумы, прафшколы, дзесяцігодкі). Тут трэба агаварыцца, што спрэчкі ідуць, зразумела, не аб тым якая рэспубліка павінна адаць свае пазыцыі—уступіць, а якая перамагчы. Спрэчкі ідуць аб тым, якой павінна быць па зьместе і ролі сярэдняя школа, якая-б набліжала нашу школу да палітэхнічнае школы. Гэта—папершае, а падругое, каб яна адпавядала і сучасным запатрабаваньням рэканструкцыі нашай народнай гаспадаркі, каб яна ўзмацняла патрэбныя кадры для забясьпячэньня прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва.

Да гэтага часу мы маем у будаўніцтве сярэдняе школы два адмоўныя крынкі. Гэта—палітэхнічная 9-гадовая школа РСФСР, якая, па сутнасьці, зьявілася не палітэхнічнаю, а славесная школаю на тыпе старое гімназіі і служыла, галоўным чынам, каналам у вышэйшую школу, якая ня толькі не давала паўнай кваліфікацыі, але нават і элемэнтарных працоўных навыкаў. Скончыўшыя гэту школу былі, па сутнасьці, людзьмі абсалютна не дастасаванымі да працоўнага жыцьця. Гэта школа, такім чынам, нам не падыходзіць, яна адкінута самім жыцьцём.

Другі напрамак—гэта украінская і беларуская прафтэхшкола, якая будавалася на базе сямігодкі. Яна выпускала і выпускае прафесыянальна - асьвечанага чалавека, які адначасова мае і належную агульную асьвету. Гэта школа, папершае, давала нам кваліфікаванага рабочага і, падругое, была праграмна зьвязана з вышэйшай школай і, такім чынам, служыла каналам у ВНУ.

Супастаўляючы гэтыя два кірункі сярэдняе школы, трэба прызнаць, што прафтэхшкола найбольш адпавядае нашым сучасным запатрабаваньням і павінна быць узята, як тып сярэдняй школы.

Тут могуць быць запытаньні, што прафтэхнічная школа супярэчыць праграмнай установцы палітэхнічнай школы. І сапраўды, прафтэхнічная школа не зьяўляецца палітэхнічнай школай, але-ж і славесная 9-ці, 10-гадовая школа таксама, па сутнасьці, не зьяўляюцца школай палітэхнічнай. Тут трэба паставіць пытаньне: што больш набліжае да славесная ці прафтэхнічная?

Вязумоўна, што

# Па БССР

## АДКРЫВАЕЦЦА ВЯЛІКАЯ ГАРБАРНЯ

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). 1-га мая ў Магілеве адкрываецца новая гарбарня, на якой будзе працаваць 700 рабочых. Пры гарбарні будзе пабудаваны дом-камуна для рабочых гарбароў на 200 сем'яў. Сродкі на пабудову гэтага дому адпускаюцца з фонду паляпшэньня быту рабочых. Апрача таго, ВСНГ дадаткова вызначае на гэтае будаўніцтва 500.000 руб.

У доме - камуне будзе пабудавана агульная кухня, сталоўка, дзіцячы сад і ясьлі. Гэта будаўніцтва мае быць скончана не пазьней 1-га кастрычніка 1930 г.

## Слаба зьбіраюцца паі

ВОРША (Наш кар.). Аршанскі ЦРК слаба зьбірае паявыя ўзносы. ЦРК мае 20.000 руб. запазычанасьці найшчыкаў па паявых узносах Да гэтага часу не разгорнута работа па павялічэньні паю да месячнага заработку. Давялі свой пай да разьмеру месячнае пэнсіі толькі рабочыя і служачыя ЦРК. Паводле заданьняў Белрабсэкцыі, за першы квартал трэба было сабраць 46.000 рублёў паявых узносаў, а сабрана толькі 11.609 руб.

## Канкурэнцыя на загатоўках будаўнічых матар'ялаў

ВОРША. (Наш кар.). Гэтымі днямі Аршанская акруговая РСІ разглядзела справу аб канкурэнцыі паміж загатоўчыкамі каменьняў для аршанскага, віцебскага і полацкага дарожных адзелаў. Загатоўшчыкі парушалі ўстаноўленыя акрангдлем цэны на загатоўку каменьняў і такім чынам падаражалі кошт будаўніцтва. РСІ пастанавіла перадаць справу загатоўшчыкаў Аршанскай акруговай пракуратуры для прыцягненьня вінаватых да судовай адказнасьці.

## Вымовы—за дрэнны збор попелу

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Прэзыдыум Гомельскага гарсавету зрабіў праверку выкананьня дырэктыў аб зьбіраньні і захаваньні попелу па прадпрыемствах і ўстановах. За нядбайныя адносіны да гэтае работы прэзыдыум гарсавету абвясьціў вымовы райпаляводсаюзу і загадчыку заразнай больніцы. Апрача таго зроблена папярэджаньне адміністрацыі каніфольнага заводу «Спартак», бровару і Жакту імя гарсавету, якія не зварачалі належнае ўвагі на зьбіраньне і захаваньне попелу.

## Справа былых кіраўнікоў заводу „Пралетары"

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Выязная сэсія Вярхоўнага суду разглядае зараз справу былой адміністрацыі Гомельскага металёкага заводу «Пралетары». На лаўцы падсудных 12 чалавек, у тым ліку і былы тэхнічны дырэктар заводу Левін. Адміністрацыя заводу нядбайна адносілася да сваіх абавязкаў і дапусьціла вялікую безгаспадарчасьць на заводзе. Заказы дзяржаўных і грамадзкіх арганізацый выконваліся на заводзе «Пралетары» нядобрасумленна і з вялікім спазьненьнем. Падліку работы не вялося. Многія рэчы, якія вырабляліся на заводзе, прыходзілася па некалькі раз перарабляць. Ад усяго гэтага завод цярпеў вялікія страты.

Левін трымаў сувязь з былымі ўласьнікамі заводу, у першую чаргу выконваў заказы прыватнікаў. Ад безгаспадарчасьці завод меў больш за 100 тысяч руб. страт. Допыт падсудных ужо скончаны.

# ЛЕПШЫ АДКАЗ БЕЛАСТОЦКІМ РАБОЧЫМ—ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ

## Апраўдаем упэўненасьць пралетараў Заходняй Беларусі

## Вытворчым уздымам і жалезнай дысцыплінай ліквідуем прарывы на прадпрыемствах

## Ваша адозва дасьць нам больш сіл і энэргіі

Мы, рабочыя фабрыкі «Адраджэньне», заслухаўшы інфармацыю аб адозьве беластоцкіх рабочых, бярэм на сябе абавязак — усю ўвагу і энэргію накіраваць на тое, каб зьнішчыць прагулы, брак, падняць прадукцыйнасьць працы і выканаць пяцігодку ў чатыры гады. Мы адчуваем сваю адказнасьць перад міжнародным пралетарыятам за выкананьне прамфінпляну. Мы ведаем, што пасьпяховае выкананьне прамфінплану зьяўляецца непасрэднай дапамогай вам у вашай гэраічнай барацьбе супроць імпэрыялізму. Ваша адозва дасьць пралетарыяту Беларусі яшчэ больш сіл і энэргіі ў барацьбе за прамфінплян. Ваша салідарнасьць з намі—залог перамогі пралетарыяту над сусьветнай буржуазіяй.

Таварышы! Змагайцеся супроць фашызму, змагайцеся супроць сацыялфашыстых, стойце цьвёрда на сваіх пастох. Выкрывайце злачынныя пляны арганізатараў вайны супроць СССР. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі будзем змагацца поплеч за сусьветную рэвалюцыю.

Няхай жыве гэраічная барацьба працоўных мас Заходняй Беларусі пад кіраўніцтвам КПЗБ!

Няхай жыве Камінтэрн — штаб сусьветнай рэвалюцыі!

Няхай жыве пяцігодка сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР—сьцяг рэвалюцыйнай барацьбы сусьветнага пралетарыяту!

## Выкананьне пяцігодкі набліжае канец капіталізму

Заслухаўшы і абгаварыўшы адозву рабочых Заходняй Беларусі аб асобных прарывах у прамысловасьці БССР, мы, рабочыя і служачыя **службы шляхоў і матар'яльнай ст. Менск таварная**, абяцаем нашым братом на класе і барацьбе—рабочым Заходняй Беларусі—выканаць і перавыканаць вытворчую праграму, для чаго яшчэ больш павысім прадукцыйнасьць працы, зьнізім сабекошт прадукцыі, узмоцнім працдысцыпліну і будзем на справе актыўнымі ўдзельнікамі сацыялістычнага будаўніцтва.

**Ні аднаго рабочага і служачага пазаўдарнымі брыгадамі!**

Мы ведаем, што выкананьне пяцігодкі набліжае канец капіталізму, узмацняе сілы пралетарыяту ўсяго сьвету для рэвалюцыйнай барацьбы.

## Рабочыя Менску аб адозьве беластоцкіх рабочых

Тав. ПЕТРАШКЕВІЧ ФЭЛІЦЫЯН ФЭЛІКСАВІЧ—старэйшы майстар хлебазаводу, вытворчы стаж—27 год

**— Я з вялікай уважлівасьцю прачытаў адозву рабочых Заходняй Беларусі. У гэтай адозьве нашы браты-рабочыя, якія знаходзяцца яшчэ пад уціскам капіталістычнай фашысцкай Польшчы, заклікаюць нас прыкласьці ўсе сілы, каб выканаць наш прамфінплян поўнасьцю. Адзіна, чым рабочыя БССР павінны адказаць на гэты заклік—абяцаньнем выканаць і перавыканаць вызначаныя партыяй і савецкай уладай пляны. Мы ўпэўнены, што даб'емся лепшых посьпехаў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Мы выканаем з гонарам ускладзеныя на нас задачы.**

***

Тав. РАДЗЮК АНТОН—рабочы цеста-мясільнага аддзяленьня хлебазаводу, вытворчы стаж—36 год.

**— Адозва рабочых Заходняй Беларусі гаворыць аб міжнародным клясавай салідарнасьці пралетарыяту ўсяго сьвету. Інтарэсы нашай пралетарскай дзяржавы зьяўляюцца адначасова інтарэсамі рабочае клясы ўсіх краін. Нашы посьпехі зьяўляюцца посьпехамі сусьветнага пралетарыяту. Таму на нас пяжыць адказьнейшая задача апраўдаць надзеі сусьветнага пралетарыяту, які заўсёды гатоў абараніць нас ад нападу капіталістычных драпежнікаў. Мы абяцаем пралетарыяту Зах. Беларусі, што выканаем прамфінплян на ўсе 100 проц. Мы прыкладзем усе сілы, каб выканаць пяцігодку за чатыры гады.**

Тав. ВАСІЛЕВІЧ УЛАДЗІМЕР—машыністы хлебазаводу, вытворчы стаж—16 год

— У адозьве да нас рабочыя Заходняй Беларусі пішуць: «Мы радуемся вашым посьпехам, але мы таксама разам з вамі глыбока перажываем і тыя асобныя прарывы, якія ёсьць на прадпрыемствах у прамысловасьці Беларусі ў справе выкананьня прамфінплану. Кожны прарыў і недавыкананьне пастаўленых плянаў наносяць страту, страту справе сацыялістычнага будаўніцтва, а значыць і справе рэвалюцыйнага змаганьня ва ўсім сьвеце».

Кожнае слова гэтай адозвы дыша пачуцьцём вялікай пралетарскай салідарнасьці. Мы павінны запэўніць нашых братоў-рабочых Зах. Беларусі, што мы справімся з пастаўленымі перад намі Камуністычнай партыяй задачамі. Мы ня толькі выканаем, але і перавыканаем наш прамфінплян.

***

Тав. ХОРУЦ Ш Л.—наборшчык 1-й дзярждрукарні, вытворчы стаж—22 гады

— Рабочыя Заходняй Беларусі сваёй адозвай паказалі, што яны вельмі ўважліва сочаць за сацыялістычным будаўніцтвам у нашай краіне. Яны радуюцца кожнаму нашаму дасягненьню і балеюць душою за кожны прарыў у выкананьні прамфінпляну. Мы павінны дабіцца ва што-б там ні стала поўнага выкананьня прамфінпляну. Адказваем нашым братом, якія змагаюцца за вызваленьне ад капіталістычнага ладу, што заўсёды гатовы падтрымаць іх і дапамагчы ім у змаганьні супроць сацыялфашыстых розных колераў. Ня гледзячы на ўсе труднасьці, якія стаяць перад намі на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, мы пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі здолеем выканаць задачы, што стаяць перад намі.

***

Тав. БЯРКОЎСКІ ВУЛЬФ—машыністы 1-й дзярждрукарні, вытворчы стаж—23 гады

— Рабочыя БССР горача адгукнуцца на заклік рабочых Заходняй Беларусі. Мы прыкладзем усе сілы, каб выканаць пастаўленыя перад намі камуністычнай партыяй задачы. Мы выканаем прамфінплян поўнасьцю. Нашу пяцігодку мы выканаем за 4 гады.

***

Тав. БАРЫСЭВІЧ — рабочы шпалернай фабрыкі імя Вароўскага

— Адозву я чытаў. Цікавая адозва. Яна яшчэ раз сьведчыць аб усіх «прыгожасьцях» фашысцкай дыктатуры Пілсудскага.

На заклік нашых братоў Заходняй Беларусі мы яшчэ больш разгорнем сацспаборніцтва. Праўда, наша шпалерная фабрыка ня мела прарываў, сабекошт зьніжаны на 14 проц., брак зьменшыўся напалову. Але на гэтых дасягненьнях мы ня спынімся. Мы абяцаем нашым братом Заходняй Беларусі значна перавыканаць прамфінплян і дабіцца зажыцьцяўленьня пяцігодкі за чатыры, або за тры гады.

## Транспартную пяцігодку—у тры гады

Мы, **рабочыя вагонных майстэрань ст. Менск таварная, у колькасьці 472 чалавек**, заслухаўшы адозву рабочых Заходняй Беларусі заяўляем, што цкабуржуазіяй не запалохае нас і не перашкодзіць будаваць сацыялізм.

На ваш заклік мы абавязуемся выканаць пяцігодку на транспарце ў тры гады, што і даводзім на справе—**за першы квартал мы перавыканалі вытворчую праграму на 11,2%, а ў другім квартале—яшчэ больш.** Мы, як авангард сацбудаўнікоў, над кіраўніцтвам кампартыі будзем працягваць узмоцненым тэмпам перабудоўваць сельскую гаспадарку і ліквідуем кулацтва, як клясу.

У адказ на ваш заклік мы аднагалосна пастанаўляем аддаць усе свае свабодныя сродкі на сацбудаўніцтва праз ашчадкасы, а таксама забавязваемся падпісацца на пазыку індустрыялізацыі —**«Пяцігодка ў чатыры гады».**

Таварышы, змагайцеся супроць польскага фашызму і сацыял - здрадніцкаў. Стойце моцна на сваіх пастох! Выкрывайце правакацыі буржуазіі супроць СССР!

Няхай жыве Камінтэрн — правадыр сусьветнага пралетарыяту!

## З гатоўнасьцю прымаем выклік

Мы, рабочыя і служачыя **ст. Менск пасажырская**, заслухаўшы адозву рабочых Заходняй Беларусі, шлем ім сваё рэвалюцыйнае прывітаньне і з гатоўнасьцю прымаем выклік—падняць прадукцыйнасьць працы і перавыканаць прамфінплян. Мы заяўляем, што транспартную пяцігодку выканаем у тры гады і што мы да гэтага ўжо прыступілі, перавысіўшы выкананьне вытворчай праграмы другога кварталу па 9 проц.

Верныя рэвалюцыйнаму абавязку, мы з вялікім напружаньнем будзем ажыцьцяўляць наказы Ільліча па калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулака, як клясы.

Мы спадзяемся, што недалёка той час, калі вы са зброяй у руках, пад кіраўніцтвам КПЗБ, возьмеце ўладу ў свае рукі і сумесна з намі пойдзеце да міжнароднай рэвалюцыі.

## Заява спэцыялістых

### „...Цесна зьвязаць свой лёс з лёсам рабочае клясы"

У ЦК КП(б)Б паступіла заява ад групы інжэнэраў аб прыёме іх у рады КП(б)Б. У заяве між іншым гаворыцца:

«У перыяд напружанага сацыялістычнага будаўніцтва, якое адбываецца в ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі н могуць быць толькі добрасумленнымі выканаўцамі сваіх абавязкаў, але павінны сьвядома і актыўна прымаць удзе разам з усей рабочай клясай у выка наньні задач, якія стаяць перад ею: ян павінны быць творцамі, арганізатарамі натхніцелямі мас сацыялістычнай р канструкцыі народнае гаспадаркі быць гатовымі ў кожны момант стан на абарону пралетарскае дыктатуры».

«Прымаючы ўдзел на працягу рад год у сацыялістычным будаўніцтве, та варыцца далей у заяве, працуючы ў ін жынэрна-тэхнічных секцыях і іншы прафсаюзных арганізацыях, усьвядоміў шы правільнасьць генэральнай лініі пар тыі ў справе індустрыялізацыі краіны калектывізацыі сельскае гаспадаркі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на баз суцэльнае калектывізацыі,—мы лічы у сучасны момант неабходным яшч больш цесна зьвязаць свой лёс з лёса рабочае клясы, каб разам з ёю пера магчы ўсе перашкоды на шляху будаў ніцтва сацыялізму.

Мы просім прыняць нас у рады К муністычнай партыі (бальшавікоў) Бе ларусі».

КАПЛАН А. М.—старшыня Бел. МБІТ
МІЛЬКАМАНОВІЧ І. А.—
адказны сакратар БМБІТ
Члены Бел. МБІТ: НАНАТСОН В.
КІПРЫЯНЕЦ К.
БУШКО К.
САФАРЭВІЧ А.
САВІЦКІ М.

## ЦК і Магілеўскаму АК КП(б)Б

Па - зачарговая партканфэрэнцыя Шклоўскага раёну ішла шчырае бальш віцкае прывітаньне ЦК і АК КП(б)Б.

Канфэрэнцыя рашуча асуджае правы апартуністычныя, антыпартыйныя п становы райкому і поўнасьцю ўхваля пастанову ЦК па гэтым пытаньні.

Канфэрэнцыя запэўняе ЦК і А КП(б)Б, што зробленыя апартуністы ныя памылкі райкомам выпраўлены.

Партарганізацыя пад кіраўніцтвам Ц і АК мабілізуе ўсе свае сілы на арган зацыю батрацка-бяднацка-серадняцкі мас вёскі для ажыцьцяўленьня задач партыі па сацыялістычнай перабудове сельскае гаспадаркі.

Няхай жыве ЦК КП(б)Б!

# ВЕСНАВЫ УЛОЎ РЫБЫ НЕ АРГАНІЗАВАНЫ

Рыбная гаспадарка Беларусі да апошняга часу знаходзіцца ў занядбанасьці, на яе не зварачаецца з боку адпаведных арганізацый належная ўвага.

Новая арганізацыя—«Белрыба»—топчацца на месцы і ніяк ня можа разгарнуць, як сьлед, работу па забесьпячэньні рабочых цэнтраў рыбай, па арганізацыі лоўлі і г. д.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ быў заслухан даклад прадстаўніка «Белрыбы» аб становішчы рыбнай гаспадаркі і аб пэрспэктывах забесьпячэньня рабочых цэнтраў рыбай.

— «Белрыба»—кажа дакладчык—мае 19 рыбных гаспадарак, што зараз складае каля 80 рыбных арцеляй. У гэтым годзе «Белрыба», паводле пляну, мяркуе вылавіць у вазёрах і ріках Беларусі 30.000 цэнтнэраў рыбы. Гэта лічба разьмеркавана па асобных акругах.

«Белрыба» вызначыла досыць шырокі плян, але-ж паказаная лічба ў 30.000 цэнтн. можа застацца на паперы, бо да апошняга часу няма патрэбнай колькасьці рыбаловаў, адсутнічае вопратка і патрэбныя прылады для лоўлі рыбы.

Такім чынам, відаць, што плян «Белрыбы» можа зьявіцца нерэальным. Аб гэтым сьведчыць і тое, што плян мінулага году выкананы толькі на 40 проц.

Млявае забесьпячэньне рыбай рабочых цэнтраў зрываюцца з-за таго, што рыба, якая ловіцца ў раёнах, там і застаецца. Некаторыя акрвыканкомы не падпарадкоўваюць пастановам ураду аб забесьпячэньні рабочых цэнтраў рыбай. Яны катэгарычна адмаўляюцца ад адпраўкі рыбы ў рабочыя цэнтры. Так, Полацкі АВК, ня гледзячы на пастанову ураду і некалькі напамінаньняў, усё-ж тармозіць з адпраўкай рыбы.

Больш таго, да апошняга часу ў Барбруйскай і інш. акругах вадаёмы знаходзяцца ў руках прыватнікаў, якія імкнуцца як мага больш вылавіць рыбы, не зварачаючы ўвагі на адпаўненьне рыбных гаспадарак.

На дакладу прадстаўніка «Белрыбы» разгарнуліся досыць жвавыя спрэчкі. Таварышы, якія выступалі, зазначылі, што рыбная гаспадарка Беларусі знаходзіцца ў безгаспадарчым стане. Цэны на рыбу за апошні час значна павялічыліся. Так, па Полацку цэны на рыбу павысіліся на 19 проц., а па некаторых акругах—на 20 проц. і больш. Ёсьць і такія выпадкі, калі асобныя цэрабкопы даводзяць павышэньне цэн на рыбу да 40 проц.

— Рыбная гаспадарка «Чырвоная Зорка» (Мазырчына) знаходзіцца ў безгаспадарчым становішчы—кажа тав. **Вашкевіч.**—У выніку ёсьць значныя страты, якія дасягаюць дзесяткаў тысяч рублёў. Загадчыкі гаспадаркі надзвычай часта мяняюцца. Зусім цяжкія ўмовы ў гэтай гаспадарцы для жыцьця рабочых.

— Аб рыбе вялікі шмат гаворыцца, але да апошняга часу рабочыя цэнтры не забясьпечаны ў належнай меры,—зазначае т. Кац.—Характэрным зьяўляецца тое, што беларуская рыба значна даражэй за растоўскую. Гэта каз за тое, што наша арганізацыя «Белрыба» ня можа піяк паставіць на належную вышыню работу па арганізацыі рыбнай гаспадаркі і лову. Усім дрэнным зьяўляецца тое, што да апошняга часу ніхто не паклапаціўся абабясьпячэньні рыбаловаў вопраткай і патрэбнымі прыладамі.

— Мы ня можам ўчкі абыйсьці такое важнае пытаньне—кажа т. **Рыжоў,**—як забесьпячэньне рабочых цэнтраў рыбай. Вазёр і рыбы нас шмат, але мы ня маем добрай арганізацыі, якая-б паставіла работу на ніжную вышыню, якая-б рацыянальна вяла рыбную гаспадарку. Рабочых і для лову рыбы не хапае, а «Белрыба» аб гэтым не клапоціцца.

Зусім мяккацелы Нагандаль, які ня можа прымусіць акрвыканкомы выканаць пастановы ўрада аб забесьпячэньні рабочых цэнтраў рыбай.

У Полацку, Мазыры і іншых акругах рыбу дастаюць вельмі лёгка, без ніякіх талёнаў, яе можа дастаць хто хоча. А рабочыя цэнтры гэтага ня ўлены.

Цэны на рыбу павышаюцца, а Наркамгандаль не зварачае гэта ўвагі. Дзе-ж тут рэальнае павышэньне зарплаты рабочых?

Трэба рашуча ўдарыць ЦРК, які купляе рыбу ў прыватніка з к. кгр., а «Белрыбе» плаціць на 52 проц.

Прэзыдыум ЦСПСБ склаў камісію для дэтальнай праверкі ўсіх дзеянняў забесьпячэньні рабочых цэнтраў і даручыў камісіі выпрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы у гэтым напрамку.

Б.

# Рацыянальна скарыстоваць эканамістых

## (У ПАРАДКУ ПРАПАНОВЫ)

Два выпускі факультэту грамадзкіх навук эканамічнага аддзяленьня Белдзяржуніверсытэту былі ў 1925 годзе. Было выпушчана 120 чал. эканамістых. З гэтае колькасьці значны процант не працуе на спэцыяльнасьці. Сярод іх ёсьць статыстыкі, кваліфікаваныя дзеловоды, рахункаводы, працаўнікі газэт, работнікі прылаўку і г. д.

Такое нерацыянальнае выкарыстаньне людзей з вышэйшай асьветай адбываецца ў нас у той час, калі адчуваецца значны недахват кваліфікаванай работнай сілы, калі выпускаюцца з унівэрсытэту людзі датэрмінова, адбываюцца датэрміновыя выпускі тэхнікумаў і прафшкол, калі перакваліфікоўваюць практыкаў, арганізоўваюцца кароткатэрміновыя курсы і г. д.

Зьезд акрпляна, які нядаўна скончыўся, канстатаваў, што акругі не забясьпечаны належнай кваліфікаванай сілай, а ў некаторых акрпляна ат няма ні аднаго эканамістага. Ты лічым, што гэтыя забытыя рэсурсы намістых, якія працуюць не па ц яльнасьці) павінны быць зьняты: ніхай работы і накіраваны на у па спэцыяльнасьці.

Для ажыцьцяўленьня гэтага мер емства трэба, папершае, у самым новым парадку выявіць ва ўст колькасьць асоб з вышэйшай ас якія працуюць не па спэцыяльна разьмеркаваць іх больш рацыян падругое, арганізаваць кароткатэ выя курсы дакваліфікацыі; пат склікаць канфэрэнцыю эканам абодных выпускаў 1925 году, пра ры, кіраўнікоў гаспадарчых і бо ных устаноў і прадстаўнікоў саюз абмеркаваньня мерапрыемстваў п тых пытаньняў.

ЛЮБЕЦКАЯ, ГАЛАДЗЕЦ, ШЫЦ Х., ЛІЎШЫЦ Д., ГАР

*Напярэдадні гадавіны сацспаборніцтва*

# ПРАЙШЛО ЎЖО 6 ДЗЁН КРАСАВІКА

## Неадкладна разгарнуць масавую самаправерку выкананьня прамфінпляну, сацдагавароў і ўдарніцтва

## Пакажам беластоцкім рабочым яшчэ адзін прыклад выразнай бальшавіцкай работы

## Бабруйскі камбінат пачынае агляд

### Ударыць па канкрэтных недахопах

3-га красавіка заўком Бабруйскага камбінату распрацаваў шырокі плян правядзеньня масавай самаправеркі выкананьня прамфінпляну, сацдагавароў і ўдарніцтва.

Для правядзеньня агляду ў маштабе ўсяго камбінату вылучаецца часовая кантрольная камісія з 7 таварышоў. Пры ЧКК будуць створаны часовыя групы па асобных галінах работы.

5—6 красавіка па ўсіх цэхах будуць праведзены зьменавыя сходы рабочых, прысьвечаныя агляду. У кожным цэху будзе вылучана прыблізна па 6 брыгад, якія павінны будуць ня толькі правесьці агляд, але і вызначыць рад канкрэтных мерапрыемстваў па паляпшэньні якасьці працы ўдарных брыгад.

Для папулярызацыі агляду заўком выпускае спэцыяльную лістоўку. Разьвешваюцца лёзунгі і плякаты. Агляду таксама будуць прысьвечаны два нумары газэты **«Пралетарская Піла».**

Гутаркі аб самаправерцы будуць праведзены ў цэхах, па курсах, у партшколе, ліквпункце і фабзавучы. Будзе таксама праведзен **сход ударнікаў камбінату.**

10-га красавіка ў клюбе дрэваапрацоўшчыкаў будзе праведзен вечар сацспаборніцтва. У чырвоных куткох арганізуюцца **выстаўкі кніг** па сацспаборніцтве і вытворча-тэхнічных пытаньнях.

У брыгады і групы мяркуецца ўцягнуць **каля 200 рабочых.**

1-га мая будзе праведзен вечар, прысьвечаны вынікам агляду.

Акрпрафбюро прымацавала да камбінату 3-х таварышоў для дапамогі ў правядзеньні агляду.

А. МАГІДАЎ.

## Рабкоры „Чырвонай Зары" прынялі выклік рабкораў „Чырвонай Бярэзіны"

Рабкоры „Камунара", гуты „Пралетары", гуты імя Домбаля, папяровай ф-кі „Прафінтэрн", віцебскай абутковай ф-кі—прымайце выклік

### АРГАНІЗУЙЦЕ РАБКОРАЎСКІЯ БРЫГАДЫ „ЗЬВЯЗДЫ"

**Дражджавы завод «ЧЫРВОНАЯ ЗАРА» за 5 месяцаў бягучага году выканаў вытворчую праграму ўсяго толькі на 83,16 проц. Тлумачыцца гэта адсутнасьцю попыту на дрожджы. Затое па іншых паказальніках ёсьць вялікія дасягненьні. Заданьне па зьніжэньні сабекошту перавыканана на 2 проц., прадукцыйнасьць працы ўзьнята на 10 проц. вышэй плянавага заданьня.**

**Але трэба адзначыць, што ёсьць яшчэ на заводзе асобныя рабочыя, якія не зацікаўлены выкананьнем прамфінпляну. Ёсьць выпадкі прыходу на работу ў п'яным выглядзе, ёсьць рад выпадкаў пакіньня працысцыплiны і прагулаў па нягрунтоўных прычынах. Калі за 4 месяцы 5 месяцаў на заводзе было ўсяго 5-ю прагулаў па нягрунтоўных прычынах, дык за адзін сакавік ёсьць 7 з паловай прагульных дзён.**

**Сход рабкораў завода ПРЫНЯЎ ВЫКЛІК РАБКОРАЎ «ЧЫРВОНАЙ БЯРЭЗІНЫ» і абвясьціў сябе ўдарным для актыўнага ўдзелу ў праверцы выкананьня прамфінпляну, сацдагавароў і ўдарніцтва, пры чым узялі на сябе рад абвязкаў: абвясьтляць у насьценгазэце дасягненьні і недахопы сацспаборніцтва, выкрываць ліквэ-ўдарнікаў, правесьці двухмесячны паход за рацыяналізацыю і змаганьне са стратамі і г. д. Сход рабкораў таксама абавязаўся ВЫЛУЧЫЦЬ РАБКОРАЎСКУЮ БРЫГАДУ «ЗЬВЯЗДЫ», якой даручана асьвятленьне на старонках «Зьвязды» ходу праверкі.**

**Ад імя сходу рабкораў—БРЭГЕР.**

## Вывучыць прычыны прарываў

На галянтарэйнай фабрыцы «Беларуска» (Менск) пачалася падрыхтоўка да гадавіны сацспаборніцтва. Вылучаны 5 ударных брыгад для праверкі выкананьня сацдагавору з ленінградзкім Ахцінскім заводам.

У часе абедзенных перапынкаў праводзяцца гутаркі з рабочымі. Па цэхах і ў сталоўцы разьвешаны лёзунгі і плякаты.

Вылучана брыгада, якая спэцыяльна займецца вывучэньнем прычын прарываў у гузікавым цэху. Гэты цэх сыстэматычна ня выконвае вытворчай праграмы. У ім ударніцтва яшчэ вельмі слаба разгорнута. Толькі за апошні час, дзякуючы камсамольскай ячэйцы, работа цэху крыху палепшылася.

З 1-га красавіка цэх перайшоў на бесьперапынку, але з прычыны дрэннай падрыхтоўкі, яшчэ і зараз няма выразнасьці ў рабоце зьмен. Рабочыя ў першыя дні ня ведалі калі прыходзіць на работу і траплялі ў іншыя зьмены, што прыводзіла да прастояў машын. Яшчэ і цяпер ёсьць выпадкі, калі у стары дзень адпачынку некаторыя рабочыя не зьяўляюцца на работу.

Рэдкалегія мяркуе выпусьціць 2 цэхавыя насьценгазэты, прысьвечаныя агляду.

На агульным сходзе моладзі была прынята пастанова, каб 2-га мая правесьці сацыялістычны суботнік.

А. Н.

## Красавік месяц—ударны

У сувязі з гадавінай сацспаборніцтва, у Бабруйску пачата падрыхтоўка да праверкі выкананьня прамфінпляну, сацдагавароў і ўдарніцтва. На прадпрыемствах вылучаюцца брыгады для праверкі. Рыхтуюцца клюбы і чырвоныя куткі.

Гэтае пытаньне абгаворвалася на апошняй парадзе партыйнага, камсамольскага і прафэсыянальнага актыву. Да прадпрыемстваў для праверкі прымацоўваецца **30 прафпрацаўнікоў і гаспадарнікаў.**

Акрутком камсамолу абвясьціў красавік месяц **ударным** і паставіў перад камсамольскімі арганізацыямі баявую задачу—ахапіць усю рабочую саўгаспную і калгасную моладзь ударнымі брыгадамі. Рыхтуюцца сходы ячэек, зьлёты «лёгкай кавалерыі», вытворчыя вечары. На 27 красавіка вызначана правесьці акруговы зьлёт ударных брыгад моладзі.

А. Н.

# „БІЛЬШОВІК УКРАІНЫ"—

## ТЭАРЫТЫЧНЫ ОРГАН ЦК КП(б)У

## (№№ 1, 2, 3, 4 за 1930 г.)

Тэарытычны орган ЦК КП(б) Украіны **«Більшовік Украіны»**, які выходзіць рэгулярна, вельмі цікавы і для нашай беларускай арганізацыі. У змаганьні за генэральную лінію партыі, супроць ухілаў ад гэтай лініі—журнал «Б. У.» прыняе актыўны ўдзел.

Усе апошнія чатыры кніжкі (№№ 1, 2, 3, 4) зварачаюць вялікую і сур'ёзную ўвагу на глыбокую тэарытычную прапрацоўку ідэалёгіі правага ўхілу і перш за ўсё — праваапартыстычных тэорый і канцэпцый т. Бухарына. Амаль у кожным нумары журналу зьмяшчаюцца артыкулы, прысьвечаныя тэй, або іншай праблеме змаганьня за марксысцка-ленінскую тэорыю. Артыкулы «Мэтадалёгія т. Бухарына» («Б. У. №1), «Праблема роўнавагі ў канцэпцыях т. Бухарына» («Б.У» №№2 і 3) і г. д. крытыкуюць апартуністычныя тэорыі Бухарына і яго школы.

У радзе рэдакцыйных артыкулаў, журнал «Б. У.» распрацоўвае пытаньні генэральнай лініі партыі. У кніжцы № 2 зьмешчаны перадавы артыкул аб «Баявых задачах весьнавой кампаніі», які мабілізуе ўвагу арганізацыі на правядзеньне гэтай важнейшай рашаючай задачы моманту. У кніжцы № 3, у перадавіцы «У наступленьні на гаспадарчы Перакоп»—ставіцца з ўсёй вострасьцю пытаньні змаганьня за выкананьне прамфінпляну і ліквідацыі прарываў. У № 3 «В. У.» зьмешчаны артыкул т. Касіёра (сакратара ЦК КП(б)У) «Аб масавай калектывізацыі, ліквідацыі кулацтва, як клясы, і чарговых задачах партыі».

Надзвычай шырока асьвятляецца ў журнале пытаньні і праблема сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Украіны. У кожным нумары ідзе некалькі артыкулаў, прысьвечаных пытаньням індустрыялізацыі і калектывізацыі краю. Вялікую цікавасьць прадстаўляе артыкул у № 1 «Б. У.»—«Дняпрабуд і Дняпракамбінат», які падрабязна асьвятлівае ход будаўніцтва самага магутнага ва ўсім Савецкім Саюзе будаўніцтва. Адзначаючы рад буйнейшых перамог і пасобныя недахопы, артыкул падагульвае работу II сэсіі ЦВК Украіны і гаворыць аб «актуальнейшай праблеме», якая ставіцца зараз у сувязі з набудовай Дняпрабуду, праблеме набудовы магутнага прамысловага Дняпракамбінату. На падрыхтоўчыя работы на набудове гэтага камбінату ў гэтым гаспадарчым годзе будзе выдаткавана ўжо 50 млн. р. Варта толькі падаць адну лічбу, каб зразумець якую грандыёзную задачу вырашае Савецкая Украіна пры актыўнай дапамозе Усяго Саюзу, будуючы Дняпрабуд і ў сувязі з гэтым прыступаючы да падрыхтоўкі будаўніцтва Дняпракамбінату. Адзіная электрамагістраль Запарожжа—Наддняпроўе будзе даваць, як паказвае артыкул, 4 мільярды кілёват-гадзін кожны год, г. зн. столькі, колькі давалі **ўсе** электрастанцыі **ўсяго** Саюзу ў 1927 годзе. Было-б вельмі карысна, калі-б у нашых газэтах і тэарытычных органах знайшло месца больш поўнае асьвятленьне гэта вялізарнейшае будаўніцтва, якое артыкул справядліва называе «прыкладнай школай мэханізаванага будаўніцтва».

Падрабязна спыняюцца на пасобных праблемах гаспадарчага будаўніцтва Савецкай Украіны артыкулы «Аб шляхох рэканструкцыі украінскай металюргіі» (№ 2), «Дасягненьні і прарывы на вытворчасьці» (№ 2), «Аб калгасным будаўніцтве Украіны ў 1929-30 г.» (№ 1), «Апал і мэталь» (№ 4) і г. д. Нясумненна, што такая прапрацоўка пасобных бакоў сацыялістычнага будаўніцтва на старонках тэарытычнага органу дае багаты матар'ял членам партыі, высоўвае новыя пытаньні, кіруе будаўнічай работай.

Цікавыя і важныя пытаньні ставяцца ў артыкуле Цэлікова «Нацыяньня ў сьвятле сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі». Артыкул займаецца асьвятленьнем становішча нацменшасьцяй на Саз. Украіне ў новай абстаноўцы сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі. Падаючы багаты лічбовы матар'ял аб становішчы нац раёнаў і пасобных нацменшасьцяй якія насяляюць УССР, артыкул паказвае, як працэс суцэльнай калектывізацыі, які ахапляе значную частку Украіны, спрыяе пасьпяховаму вырашэньню пытаньня сацыялістычнай рэконструкцыі нацыянальных раёнаў.

Даволі шырока пастаўлен у журнал міжнародны аддзел і асьвятленьне рэвалюцыйнага руху Захаду. У № 3 часопісі зьмешчаны артыкул «Аб XI кангрэсе кампартыі Англіі», «Аб амэрыканскім крызісе», «2-й Гаагскай канфэрэнцыі». У № 4, перадавіца прысьвечана разгорнутай за апошні час на ўсім капіталістычным сьвеце антысавецкай кампаніі. Цікавым зьяўляецца артыкул з Даніловіча, які зьмяшчаецца ў дзьвёх кніжках (№ 2 і 3) аб «Барацьбе сельскага пралетарыяту і сельскай беднаты на Заходняй Украіне». Гэты артыкул асьвятлівае стан рэвалюцыйнага змаганьня заходня-украінскіх працоўных мас супроць польскага фашызму, сацыял і нацыял-фашызму.

У журнале пастаўлена рэгулярная бібліяграфія з рэцэнзіямі важнейшых кніг, якія выходзяць, як у выдавецтве Дзяржвыдавецтва, так і ў выдавецтве Дзяржвыдавецтва Украіны. Заслугоўвае асаблівае ўвагі падрабязны разбор, які зроблены шматлікай калгаснай літаратуры, вышаўшай за апошні час і маючай ня мала буйнейшых палітычных памылак.

Наогул, журнал выконвае вялікую работу і адыгрывае буйную ролю ў справе змаганьня за лінію партыі, змаганьня супроць усіх ухілаў ад лініі партыі. «В. У.» заслужана карыстаецца шырокай папулярнасьцю ў радох арганізацыі КП(б)У.

***

Тут нельга не адзначыць буйнога недахопу ў нас, у БССР, які выяўляецца ў надзвычай нерэгулярным выходзе нашага тэарытычнага органу «Більшавік Беларусі». Толькі к канцу сакавіка мы будзем мець першую кніжку журнала за 1930 год. У абстаноўцы абвастр

# Зрываюць харчаваньне калгасьнікаў на палявых работах

## Белкалгасцэнтр і белкаапсаюз адмаўляюцца ад выкананьня раней вызначаных плянаў

«Зьвязда» ў свой час ужо сыгналізавала аб небясьпецы зрыву арганізацыі грамадзкага харчаваньня ў калгасах і саўгасах Беларусі.

Прайшло ўжо шмат дзён. Ніякага зрыву ў гэтай справе няма.

Белкаапсаюз раней высунуў плян арганізацыі ў калгасах 200 сталовак і 400 палявых ачагоў.

Замест выкананьня свайго-ж пляну БЕЛКААПСАЮЗ ЗАРАЗ НАОГУЛ АДМАЎЛЯЕЦЦА АД ЯГО, ЛІЧАЧЫ ГЭТЫ ПЛЯН НЯЖЫЦЬЦЁВЫМ.

Зусім заглухла пытаньне аб арганізацыі палявых ачагоў - кухань.

На мясцох у справе арганізацыі грамадзкага харчаваньня—поўная блытаніна. З Бабруйскай акругі паведамляюць, што там вызначана арганізацыя сталовак у 10 калгасах, але практычна да гэтай работы не прыступілі. Тое-ж самае і па Гомельскай акрузе, дзе плян складзен на 19 сталовак.

На мясцох ня ведаюць, на якіх падставах павінны арганізоўвацца гэтыя сталовыя.

Катастрафічнае становішча з кадрамі для грамадзкага харчаваньня. ЗАМЕСТ ПАТРЭБНЫХ СОТЕНЬ РАБОТНІКАЎ У АСОБНЫХ РАЁНАХ РЫХТУЕЦЦА ПА НЕКАЛЬКІ ЧАЛАВЕК.

Наогул-жа дагэтуль НІ Ў БЕЛКАЛГАСЦЭНТРЫ, НІ Ў БЕЛКААПСАЮЗЕ, не гаворачы ўжо аб мясцох, ня вырашаны такія асноўныя пытаньні, як ВОДПУСК СРОДКАЎ, ПАБУДОВА ПАМЯШКАНЬНЯЎ ДЛЯ СТАЛОВЫХ і г. д.

Яшчэ горшая справа ў саўгасах, дзе павінна быць арганізавана 20 сталовак. БЕЛКААПСАЮЗ, ЗГОДНА ПЛЯНУ, ВЫЗНАЧЫЎ АРГАНІЗАЦЫЮ СТАЛОВЫХ ТОЛЬКІ Ў ТЫХ САЎГАСАХ, ДЗЕ ЁСЬЦЬ 500 РАБОЧЫХ У ТОЙ ЧАС, ЯК ТАКІХ САЎГАСАЎ У БССР НЯМА.

Можна з упэўненасьцю сказаць, што пры такім тэмпе работы ДА ПАЧАТКУ ПАЛЯВЫХ РАБОТ АМАЛЬ НЯ БУДЗЕ АДКРЫТА НІ АДНА СТАЛОЎКА.

Спажывецкая каапэрацыя Беларусі, замест таго, каб сапраўды павярнуцца тварам да калгасаў, займаецца плянамі, якія застаюцца толькі на паперы і АД ЯКІХ ЯНА ПОТЫМ САМА АДМАЎЛЯЕЦЦА.

М. К.

АД РЭДАКЦЫІ: Мы просім органы РСІ гэту справу як мага хутчэй расьследаваць і вінаватых у зрыве падвозу харчоў на палявыя работы прыцягнуць да суровай адказнасьці.

# Скончыліся перавыбары заўкому „Камунар"

## На заводзкай канфэрэнцыі

Роўна а 4-й гадз. аркестр заграў збор. З усіх цэхаў заводу «Камунар» вярнуліся рабочыя.

Кадэна з 400 рабочых з плякатамі і лёзунгамі — «Выканаць прамфінплян на ўсе 100 проц.», «Патрабуем выразнага кіраўніцтва ўдарніцтвам і сацспаборніцтвам» — накіраваліся на канфэрэнцыю, у клюб металістых.

Заводзкія арганізацыі добра падрыхтаваліся да канфэрэнцыі. Па ўсіх цэхах былі праведзены гутаркі, выбрана 150 дэлегатаў, праведзены інструкцыйныя нарады дэлегатаў і г. д.

А 5-й гадз. канфэрэнцыя прыступіла да абгаварэньня наказу новаму заўкому. Усе прапановы былі прасякнуты адной асноўнай ідэяй — **ва што-б там ні стала поўнасьцю выканаць прамфінплян.**

— Заўком павінен дабіцца зьніжэньня сабекошту на 27 проц., узьвышэньня прадукцыйнасьці працы. Заўком павінен змагацца з прагульшчыкамі, рвачамі і кулякамі, якія падрываюць вытворчасьць, паладжваць над імі паказальныя суды. Заўком павінен дабіцца зьніжэньня браку і прастою на вытворчасьці.

Заўкому даручана зьвярнуць асаблівую ўвагу на падрыхтоўку кадраў, на ўзьняцьце тэхнічнай пісьменнасьці рабочых заводу «Камунар».

— Сыстэматычнае плянавае кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам — гэты пункт прапанавалі многія дэлегаты.

— Трэба пачаць праверку сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Трэба дабіцца ад адміністрацыі выкананьня пастаноў вытворчых нарад і прапаноў рабочых.

Вось асноўныя пункты наказу новаму фабзаўкому.

Ад імя ЦСПСВ канфэрэнцыю вітаў тав. **Калодка**, які ў сваёй прамове адзначыў, што перавыбары фабзаўкому заводу «Камунар» павінны паслужыць прыкладам для ўсіх іншых прадпрыемстваў.

Канфэрэнцыя зацьвердзіла склад новых 6 цэхавых прафбюро.

А. МАНЬКОЎ.

# МЕНСК

## Месячнік збору металяломy працягнуты да 1-га мая

Дырэктыва ЦСПСБ аб удзеле прафарганізацый у месячніку збору металяломy ня выканана. Фабзаўмясцкомы сталі ў баку ад месячніка і нічым не дапаялі збору лому. У выніку месячнік быў амаль што сарваны.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў працягнуць месячнік да 1-га мая і прапанаваў ЦП і АПБ саюзаў тэрмінова прыняць захады да поўнага ажыцьцяўленьня дырэктывы ЦСПСБ аб дапамозе збору лому.

Апрача таго, прапанавана ўсім ЦП саюзаў тэрмінова склясьці брыгады з добраахвотнікаў для праверкі выкананьня фабзаўмясцкомамі дырэктывы і практычнай дапамогі ў правядзеньні кампаніі.

## Белкалгасбуд не падрыхтаваны да будаўніцтва

Эканомнарада абмеркавала пытаньне аб падрыхтоўцы Белкалгасбуду да будаўніцтва ў аграмаджаным сэктары сельскае гаспадаркі. Нарада адзначыла, што дырэктывы ЭКАНА адносна падрыхтоўкі да будаўніцтва НКЗ і Белкалгасцэнтрам ня выкананы.

Эканомнарада прапанавала НКЗ безадкладна ажыцьцёвіць дырэктывы адносна разгортваньня будаўніцтва ў аграмаджаным сэктары сельскае гаспадаркі і забесьпячэньня гэтага будаўніцтва неабходнымі матар'ыямі.

### ПРЫЕЗД КАМІСІІ НК РСІ СССР

У Менск прыехала камісія НК РСІ СССР для праверкі вынікаў калгаснага будаўніцтва па БССР. Старшынёй камісіі зьяўляецца т. ІВАНОЎ.

### ЛІКВІДАЦЫЯ ДЗЯРЖФІНКАНТРОЛЮ

Гэтымі днямі адбылася агульна-гарадзкая нарада галоўбухаў дзяржаўных устаноў, якая заслухала даклад НК РСІ аб новых формах фінкантролю ў сувязі з ліквідацыяй дзяржфінкантролю НКФ СССР.

Нарада ўхваліла пастанову аб ліквідацыі дзяржфінкантролю і пастанавіла адкрыць запіс добраахвотнікаў-бухгальтараў для дапамогі органам РСІ, да якіх пераходзяць функцыі фінкантролю.

### ПЕРАДАЧА ТАВАРНЫХ МЛЫНОЎ «САЮЗХЛЕБУ»

Эканамічная Нарада пастанавіла перадаць «Саюзхлебу» ўсе млыны ў гарадох, якія пераапрацоўваюць збожжа для заготоўчых органаў. Перадача павінна быць скончана да 15-га красавіка.

## За дзень

— Прэзыдыум гарсавету зацьвердзіў плян арганізацыі саўгасна-калгаснага агра-камбінату на тэрыторыі прыгараднага сельсавету. Даручана Акрыпыцу распрацаваць структуру кіраўніцтва агра-камбінату.

— Гарсавет пастанавіў пабудаваць у Менску мэханічную пральню з прапускной здольнасьцю першай чаргі ў 150-190 тон бялізны. Сёлета будзе закладзен фундамант гэтай пральні. Пральня мае быць пушчана не пазьней 1-га кастрычніка наступнага году.

— Белжылсавет прызнаў неабходным, каб плата за кватэры ў дамох ЖАКТ'аў уносілася праз ашчадкасы.

— Наркамасьветы БССР прызнаў неабходным, каб у гэтым годзе ў БНУ і навукова-дасьледчых інстытутах было ня менш 390 асьпірантаў, 60 проц. асьпірантаў павінны быць рабочыя і батракі.

### РАБОЧЫ - ВЫЛУЧЭНЕЦ—НАМЕСЬНІК ЗАГАДЧЫКА АКРФА

Прэзыдыум АВК назначыў намесьнікам загадчыка Менакрфа рабочага-выпучэнца Чэрвеньскай друкарні т. АЛЬПЭРЫНА.

## Пабудова элеватараў у БССР

У зьвязку з недахватам у БССР складаў для хаваньня збожжа, Саюзхлеб распачынае сёлета вялікае будаўніцтва.

У Воршы і Гомелі будуць пабудаваны элеватары на 800.000 пудоў кожны, а таксама 2 сьвірны з мэханізаванай пагрузкай і разгрузкай і 41 склад на 1.500 пудоў збожжа кожны.

Апрача таго, для мясцовага жыта, якое мае вельмі многа вадкасьці (17 проц.), будуць пабудаваны спэцыяльныя сушыльні.

## Да адказнасьці—за невыкананьне пастаноў аб арганізацыі машына-конных станцый

Эканомнарада адзначыла, што Белкалгасцэнтр, Полацкі, Мазырскі, Аршанскі акрвыканкомы не прынялі мер да арганізацыі машына-конных станцый. Наркамзему, Белкалгасцэнтру і акрвыканкомам даручана законніць арганізацыю іх да 10-га красавіка.

Упоўнаважанаму СНК т. Рачыцкаму даручана прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці асоб, якія не прынялі мер да арганізацыі машына-конных станцый.

## „Сьлешна, вельмі тэрмінова"

Полацкі акр. спажыв. саюз прапанаваў Полацкаму аддзяленьню Белдзяржгандлю ў тэрміновым парадку прыняць ад яго 25 вагонаў рознага рызьбя. Матываваў сьпешнасьць сваёй прапановы акр. спаж. саюз тым, што з надыходам вясны ўсе гэтае рызьбё можа папсавацца, нашкодзіць. Тут патрэбна была тэрмінова вярстка аддзяленьне Белдзяржгандлю. Полацкае аддзяленьне Белдзяржгандлю было моцна зьдзіўлена такой сьпешнай прапановай спажыв. саюзу. Для прыёму аж 25 вагонаў рызьбя Полацкі Белдзяржгандаль быў зусім не падрыхтаваны: ні складаў, ні людзей на такую колькасьць сырцу ў яго распараджэньні ня было.

Полацкі акр. спажыв. саюз добра ведаючы, што Белдзяржгандаль зьвяляецца асноўным экспартэрам другарадных відаў сырцу, чамусьці сабранае рызьбё не здаваў яму паступова па частках, а толькі падумаў аб здачы пасьля таго, як у яго назбіралася за ўсю зіму аж 25 вагонаў усялякага рызьбя. З прычыны такое нядбайнасьці і канкуренцыі з боку Полацкага акр. спажыв. саюзу рызьбё пачынае псавацца. Між тым, яно мае вялікую каштоўнасьць для дзяржавы. За рызьбё саўтасы і калгасы атрымліваюць трактары.

У справе аб несвоечасовай здачы рызьбя. Полацкім акр. спажыв. саюзам пайшна ўмяшацца пракуратура і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

Л Арскі.

# ЛЕЗУНГІ

## да антывялікодкай кампаніі

1. Супроць вялікодных сьвят, за 5-годку ў 4 гады.
2. Змаганьне з рэлігіяй—змаганьне за пяцігадовы плян.
3. Паскорым пагібель рэлігіі актыўным удзелам у сацыялістычным будаўніцтве.
4. Рэлігія—зброя контр-рэвалюцыі ў яе змаганьні з індустрыялізацыяй краіны, узмоцнім змаганьне з рэлігіяй—паскорым тэмп індустрыялізацыі.
5. Суцэльнай калектывізацыяй сельскай гаспадаркі даб'ем кулака і паскорым пагібель рэлігіі.
6. У дні вялікодных сьвят ніводнага прагульшчыка.
7. Папы, кяндзы, рабіны, сэктанты і кулакі—ворагі калектывізацыі. Узмоцнім змаганьне з рэлігіяй, паскорым справу калектывізацыі.
8. Агнём самакрытыкі замадуем ячэйкі СВБ.
9. Скарыстаем эваны на справу індустрыялізацыі.
10. Саўгасьнікі і калгасьнікі—у рады СВБ.
11. Супроць вялікодных сьвят, за новы бязбожны быт, за новага чалавека.
12. На змаганьне з рэлігіяй мабілізуем працоўныя масы.
13. За бесьперапынку—супроць рэлігіі.
14. У адказ на заклік папы рымскага да «крыжовага паходу» супроць СССР будзем умацоўваць абарону краіны.
15. Працоўныя жанчыны,—у рады СВБ.
16. Поўнасьцю выканаем плян веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі.

* * *

Пры правядзеньні антывялікодняй кампаніі рэкамэндуецца карыстацца наступнай літаратурай.

1) Антывялікодныя зборнікі для гораду, вёскі і школ, выданьне «Бязбожнік» 1930 г.
2) Часопісь «Антырэлігійнік» № 3 за 1930 г. і № 2 за 1928 г.
3) Газэта «Бязбожнік» за 1930 г., пачынаючы з 10 нумару.
4) «Календар камуніста» за 1925 г.
5) Румянцаў—«Пахаджэньне вялікадня».
6) Рожыцын—«Пахаджэньне вялікадня».
7) Бухарын—Фінансавы капітал у мантыі папы.
8) Лапіцкі—«Крыжовы паход супроць 5-годкі».

ВЫКАНКОМ ЦС САЮЗУ ВАЯЎНІЧЫХ БЯЗБОЖНІКАЎ БССР.

## Што перадае Менская радыё-станцыя

**Панядзелак, 7-га красавіка:**
17-00. Пасьлябедзены канцэрт.
17-30. Палітычная перадача.
18-00. Беларуская радыёгазэта.
19-00. Паверка часу.
19-00. Літаратурна-музычная перадача.
20-00. Рабоча-сялянскі ўнівэрсытэт па радыё.
21-00. Нямецкая мова.
21-30. Канцэрт.

**Аўторак, 8-га красавіка:**
17-00. Пасьлябедзены канцэрт.
17-30. Перадача для піянэраў і школьнікаў.
18-00. Беларуская радыёгазэта.
19-00. Паверка часу.
19-00. Сялянская радыёгазэта.
20-00. Рабоча-сялянскі ўнівэрсытэт па радыё.
21-00. Газэта на літоўскай мове.
21-30. Канцэрт.

**Серада, 9-га красавіка:**
17-00. Пасьлябедзены канцэрт.
17-30. «Беларускі Бахрах».
18-00. Беларуская радыёгазэта.
19-00. Паверка часу.
19-00. Беларуская работніца і сялянка па радыё.
20-00. Рабоча-сялянскі ўнівэрсытэт па радыё.
21-00. Камсамольская вечарынка.
21-00. Канцэрт.

**Чацьвер, 10-га красавіка:**
17-00. Пасьлябедзены канцэрт.
17-30. Перадача для піянэраў і вучняў.
18-00. Беларуская радыёгазэта.
19-00. Паверка часу.
19-00. Камсамольская газэта «Чырвоная Зьмена» па радыё.
20-00. Рабоча-сялянскі ўнівэрсытэт па радыё.
21-00. Газэта на яўрэйскай мове.
21-30. Канцэрт.

# ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Культпроп Мен. АК КП(б)Б паведамляе, што па дыспуце «Аб тэарэтычнай вучобе партыйнага і камсамольскага актыву, які адбудзецца сёньня ў 18 гадз. у Доме Камасьветы, павінны прысутнічаць у абавязковым парадку: партыйны і камсамольскі актыў, які нідзе ня вучыцца, загадчыкі сэктарамі вучобы парт'ячэек і прапагандыстыя сеткі партыйнае і камсамольскае асьветы.

### СХОД Т-ВА ЭКАНАМІСТЫХ І АГРАРНІКАЎ МАРКСЫСТЫХ

Заўтра, у 19 гадз. у ленінскім габінэце Камвузу адбудзецца агульны адкрыты сход таварыства.

Парадак дня: 1. Дакл. т. Пікус: «Сельска-гаспадарчая эканомія т.т. Ляшчэнка, Гардзеева і Сафарава». 2. Арганізацыя. Запрашаюцца: НДІ, прап. Наркамзему, Дзяржпляну, нав. прап. эканамістыя БАН і БДУ.

### СЁНЬНЯ

**Дом Камасьветы.** У 18 гадз. — дыспут на тэму: «Зьмест, формы і мэтады вучобы партактыву». Уступны даклад т. Камэнштэйна. Білеты па РК КП(б)Б.

**Мен. АК КП(б)Б** (пак. 19). У 12 гадз. адбудзецца нарада пры культпропе АК КП(б)Б на цытаньні культурнага абслугоўваньня нацменшасьняй.

На нараду запрашаюцца т.т. Гершанбаум, Сабалеўская (акрінспэктура асьветы), Прынц — «Орка», Рубінштэйн і Лёвітэ — газ. «Акцябр», Альтман — «Энэргія», Кац — ЦСПСБ, Мятліцкі — ЛКСМБ, Голмштон — яўрэйтэхнікум, Абэрфэльд — польпедтэхнікум, Валешка — Дзяржвыдавецтва, Гольдзін — клюб імя Леніна, Зржэльскі і Вакштэйн — клюб імя Розы Люксэмбург, Спарынскі — НКА, Кірштэйн, Маэзпус і Вішнеўская — АК КП(б)Б. Явка абавязковая і без сказьненьня.

**Дом Асьветы.** Сход калектыву ЛКСМБ працасьветы. Пач. у 19 гадз.

**Пэдгабінэт.** У 19 гадз. — сэкцыя палітэхнічнага выхаваньня. Дакл.—Сувязь літаратуры з вытворчасьцю, як адна з умоў палітэхнізму школы. Дакладчык—Сабалеўскі.

**Пэдфак** (фіз. аўд.). У 18 г. 15 м. — чарговыя заняткі антырэлігійнага універсытэту.

**Дом санасьветы.** Пасьлядз. Менскага акр. к-ту т-ва па барацьбе з алкагалізмам. Пач. у 19 гадз. Запраш. прадстаўнікі антыалкагольных ячэек, саюзу бязбожнікаў, акр. інсп. нарасьветы, МЦРК і Беддзяржкіно.

**Пушкінская бібліятэка.** У 18 з паловаю гадз. пасьлядз. бібліяточ. савету. На парадку дня: 1. Антывялікодні кампанія ў біб-ках і прыгаразд. хат-чит. і 2. Інфармацыя аб рабоце біб-кі імя Д. Беднага. Прысутнасьць заг. біб. аддзяленьняў і прыгар. хат-чыт. абавязкова.

**Выстаўка антырэлігійнай літаратуры** адкрыта пры навуковым аддзеле Пушкінскай бібліятэкі. Дакладчыкам літаратура выдаецца на дом.

У бібліятэцы імя Д. Беднага (Камароўка) арганізавана плякатная антырэлігійная выстаўка.

### ЗАЎТРА

**Дэкадны Камвуз.** Чарговыя заняткі на ўсіх 3 цыклях у 18 гадз. Лектары—Аксэлрод, Мазэль і Саевіч.

**БДУ.** У 18 гадз. у актавай залі БДУ адбудзецца агульны адкрыты сход парткалектыву БДУ. Запраш. камсамольскі беспарт. студэнцтва, навуковыя і тэхнічныя працаўнікі. Парадак дня: справаздача бюро і перавыбары.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.


Праўленьне клюбу друкароў сумесна з юнсэкцыяй наладжае

ВЯЛІКІ ВЕЧАР

„РВАНАЙ ГАЛЁШЫ"

ВЕЧАР АДБУДЗЕЦЦА 8-га КРАСАВІКА

Праграма вечару:
1. Канцэрт з удзелам артыстаў Ленінградзкіх і Маскоўскіх тэатраў.
2. Балетнае адзяленьне.
3. Сымфанічны аркестр.
4. Утыль віктарына.

ЗА ЛЕПШЫЯ АДКАЗЫ АТРЫМОЎВАЮЦЬ ПРЫЗЫ.

Грае духавы аркестр музыкі.

На вечар запазуць тых, хто прыйдзе ня менш 2-х пілеграм рознага утылю. Утыль адхеньваецца на білет штодзённа ў клюбе ад 6-й да 9-ай гадзіны.

СЁНЬНЯ, а 6-й гадз. веч. у памяшканьні клюбу Працасьветы

склікаецца

РАЁННАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ

ўсіх дэлегацкіх сходаў Фрунзаўскага раёну.

12-га красавіка—агульнагарадзкі сход усіх рабкораў, ваенкораў, рэдкалегій насьценных газэт і шматтыражак «лёгкай кавалерыі»

У суботу, 12-га красавіка, роўна а 6 з пал. гадз. увечары, у клюбе К. Маркса склікаецца

агульна-гарадзкі сход рабкораў, ваенкораў, рэдкалегій насьценных газэт, шматтыражак і атрадаў „лёгкай кавалерыі".

На парадку дня: „Друк у барацьбе за прамфінплян".

Абмеркаваньне [illegible] рабкораў [illegible] разам з усебеларускай нарадай рэдактароў фабрычна-заводзкіх шматтыражак. Білеты на сход разьмяркоўваюцца рэдакцыямі газэт.

Сэктар друку Культпропу ЦК КП(б)Б і рэдакцыі цэнтральных газэт.

12-га красавіка—сход членаў сэкцыі інжынэрна-тэхнічных сіл і гаспадарнікаў

У суботу, 12 красавіка, роўна а 6 з пал. гадз. увечары у памяшканьні клюбу імя К. Маркса, склікаецца

агульна-гарадзкі сход членаў сэкцыі інжынэрна-тэхнічных сіл і гаспадарнікаў гор. Менску

разам з агульна-гарадзкім сходам рабкораў і дэлегатамі усебеларускае нарады рэдактароў шматтыражак.

На парадку дня: „Друк у барацьбе за прамфінплян".

Білеты на сход разьмяркоўваюцца ІТС і ВСНГ.

Бюро ІТС ЦСПСБ. Прэзыдыум ВСНГ.

12-га красавіка—агульнагарадзкі сход работнікаў друку

У суботу, 12 красавіка, а 6 з пал. гадз. увеч. у памяшканьні вялікай залі клюбу імя Карла Маркса

СКЛІКАЕЦЦА

агульнагарадзкі сход работнікаў друку,

які адбудзе разам з усебеларускаю нарадай рэдактароў фабрычна-заводзкіх шматтыражак.

На парадку дня: „ДРУК У БАРАЦЬБЕ ЗА ПРАМФІНПЛЯН".

Старшыня Белбюро Сэкцыі работнікаў друку ШАСТАКОЎ.


# З лістоў рабселькораў

### НАРКАМЗЕМ УПАРТА МАЎЧЫЦЬ

У Заходняй вобласьці адбывалася падсечка сасны як заходнім раёнам Дзяржтрэсту «Лесахім», так і Наркамземам Беларусі. Гэта справа зусім новая і патрабуе выключна вялікае напружанасьці рабочай масы і кіруючага складу.

Заходні раён «Лесахім» выклікаў на саспаборніцтва Наркамзем Беларусі, які пасьля доўгай цяганіны і адпісак прыняў выклік.

У студзені месяцы «Лесахім» падагуліў вынікі і паслаў іх у НКЗВ. Але апошні выкручваецца ад абмену вынікамі і ня гледзячы на напамінкі «Лесахіму» — маўчыць.

Рабочыя і тэхнічны склад заходняга раёну «Лесахім» вынесьлі грамадзкае ганьбаваньне Наркамзему Беларусі.

56 подпісаў.

### АБУРАЮЧЫ ЎЧЫНАК СТАРШЫНІ РВК

Горацкі райвыканком (Аршанчына) пастанавіў па Слабодзкай вул., дзе густа жыве насельніцтва, пабудаваць заразны барак. Насельніцтва такім учынкам раёвыканкому абурана. Жыхары гэтай вуліцы зьвярнуліся з просьбай да старшыні РВК, каб ён скасаваў сваю пастанову, але замест дапамогі, яны атрымалі такі адказ: «Я не хачу з вамі гаварыць, гэта справа ня вашага розуму».

— Дык мы-ж ня хочам хварэць—казалі грамадзяне.

— Хварэйце, мы будзем вас лячыць.

Урэшце, старшыня РВК так разышоўся, што ўсіх пакуганяў вон. Між іншым, барак ёсьць, але ён ад гарадка знаходзіцца на адлегласьці каля 3-4 кілёмэтраў.

РСІ трэба ўмяшацца ў гэту справу.

15 подпісаў.

### АБЕДЫ З ТАРАКАНАМІ

Работа ў дыетычнай сталоўцы № 11 пастаўлена дрэнна. Калі сёньня заказаш абед, то назаўтра заказанага абеду не атрымаеш.

Бываюць і такія факты, калі разам з абедам падаюцца звараныя тараканы. У сакавіка аднаму паведвальнікаў падалі абед з тараканамі. А такія факты ня рэдкія.

Г.

### ПРЫМІРЭНЧЫЯ АДНОСІНЫ ДА КУЛАКА

Кулак з вёскі Грабянёва (Магілеўшчына) Каратквіч Кузьма распрадаў маемасьць: прадаў цішком жывёлу, хлеб і г. д. Акрамя гэтага Каратквіч экспліатаваў батракоў.

Да гэтага злоснага кулака прыйшла аднесься нарсудзьдзя т. Магілеву т. Эстэркін.

10 лютага разглядалася крымінальная справа па абвінавачаньні кулака Каратквіча ў разбазарваньні маемасьці. Судзьдзя Эстэркін па гэтай справе рынес апраўдальны прыгавар.

Вось як прымірэнча судовыя працаўнікі аднесьліся да кулака.

Штучны.

### ЧЫМ ВЫ ЛЕПШЫЯ...

Белсампрамсаюз запірае рабочых-выдлучэнцаў Кушнярова, Ліпкінда і Іткінда, якія былі вылучаны на працу ў сыстэме саматужна-прамысловай каапэрацыі. Тав. Кушняроў 7 месяцаў зусім ня меў пастаяннай работы, яму нават не далі стала і крэсла. Вылучэнцы Ліпкінд і Іткінд таксама цэлымі днямі сядзяць без работы і чакаюць, пакуль хто-небудзь з членаў праўленьня Белсампрамсаюзу зробіць ім ласку і дасьць якое-небудзь даручэньне. Гэтыя рабочыя абураны такімі адносінамі да іх і просяць адміністрацыю вярнуць іх назад на вытворчасьць, але член праўленьня Белсампрамсаюзу зьвяўчана адказвае: «Чым-жа вы лепшыя за мяне, я таксама сядзеў 6-7 месяцаў і чакаў і вы можаце сядзець, а можа што-небудзь і зноўдзецца»

Кіраўнікі Белсампрамсаюзу, відаць, забылі пра дырэктывы партыі аб арабочаньні нашага апарату. Трэба зьнішчыць такія ненармальныя адносны да рабочых-вылучэнцаў і стварыць спрыяючыя ўмовы для іх працы ва установах.

Барыс Чуткі.

### МАЙСТЭРНЯ НЕ НА СВАІМ МЕСЦЫ

Справа з рамонтам пішучых машынак (Менск) у сучасны момант пастаўлена дрэнна. Майстэрня па рамонце машынак знаходзіцца ад цэнтру гораду вельмі далёка, амаль на самай акраіне, дзе палата мер і вагі. У пішучай машынцы бывае зусім пазначны рамонт, але яе трэба везьці аж на акраіну, траціць значныя сродкі на перавозку і г. д. Акрамя таго, мелі месца выпадкі ломкі машынак у часе перавозкі іх. Больш таго, машыністкі, з-за пязначнага рамонту машынкі, які можна зьнішчыць хутка, робяць прастоі. Усё гэта дзяржаве каштуе шмат грошай.

Зараз установы пачалі рамантаваць машынкі ў прыватнікаў, а дзяржаўная майстэрня можа застацца без работы.

Трэба майстэрню перанесьці бліжэй да цэнтру, устанавіць тэлефон для выкліку майстроў, каб унікнуць дэфэктаў.

Б.

### ЧУЖАКІ ПАД КРЫЛОМ МЕНАКРЗА

У Менакрза на пасадзе акруговага гідратэхніка працуе нейкі Александровіч. Апошні ня хоча выконваць дырэктыў ураду аб перадачы спэцыялістых у распараджэньне Палаводсаюзу. Так, з 30 гідратэхнікаў пераданы на работу ў калгасы толькі 3 спэцыялістыя.

Больш таго, пад крылом Александровіча знаходзяць сабе прытулак чужыя элементы, напрыклад, выключаны з Політэхнікуму Гэрман, Анісовіч, Васільеў і Кухарэнка знайшлі сабе прытулак у Менакрза.

Гэтым пытаньнем адпаведным органам трэба зацікавіцца.

Тры подпісы.

# Першамайскі падарунак політзьняволеным

Менскі акруговы камітэт МОПР'у на апошнім пасяджэньні прэзыдыуму пры абгаварэньні дырэктывы аб удзеле МОПР'у ў першамайскім сьвяткаваньні, пастанавіў зьвярнуцца да ўсіх членаў МОПР'у ў першамайскім сьвяткаваньні, ПАДВОЙЦЬ НА МАЙ МЕСЯЦ СВОЙ ЧЛЕНСКІ ЎЗНОС, ШТО ЗЬЯВІЦЦА ПЕРШАМАЙСКІМ ПАДАРУНКАМ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫМ І ІХ СЕМ'ЯМ.

Гэтае мерапрыемства дасьць яшчэ 5.000 рублёў на дапамогу змагаром рэвалюцыі.

АК МОПР'у прапанаваў усім ячэйкам МОПР'у 1-га і 2-га мая на сходах і інтэрнацыянальных вечарох узьняць перад працоўнымі массамі пытаньне аб падваеньні членскага ўзносу за май.

Менакругком МОПР'у ВЫКЛІКАЕ ЎСЕ АКРУГКОМЫ МОПР'У БЕЛАРУСІ ПАСЬЛЕДАВАЦЬ ЯГО ПРЫКЛАДУ І ШЫРОКА ПАПУЛЯРЫЗАВАЦЬ ГЭТАЕ МЕРАПРЫЕМСТВА.


Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"
З панядзелка, 7 красавіка
З ПРЫЧЫНЫ ВЫКЛЮЧНАГА ПОСЬПЕХУ
2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі
мастацкі фільм
ЮДА
МЕЛАДРАМА Ў 6 ЧАСТКАХ.
У гал. рол.: Н. Рагожын, Э. Цэсарская, Н. Кавалёва, Н. Іваноў.
Початак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса адкрыта ад 5 гадз.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"
З панядзелка, 7 красавіка
мастацкі фільм па аповесьці
Д. Фурманава
МЯЦЕЖ
у 6 частках.
Початак 1-га сэансу а 2 г., 2-га а 3 г. 30 м.
Каса адкрыта ад 12 гадз. дня.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Сезон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску
Б. Лаўрэнеў.
Панядзелак, 7 красавіка для саюзу металістых
РАЗЛОМ
п'еса ў 4-х дзеях.
Рэшта білетаў у касе тэатру і ў рабочай касе. Початак а 8 гадз.

Кіно „СПАРТАК"
З панядзелка, 7 красавіка
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ выступленьне
РАЗАНСКІХ БАБ
ФЁДАРАВАЙ і РУСІНСКАЙ.
У рэпэртуары частушкі-лубок
На экране выдатны фільм БАБЫ РАЗАНСКІЯ
драма ў 6 частках.
Початак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 г. 30 м.
БАБЫ РАЗАНСКІЯ НА СЭЖЫ
БАБЫ РАЗАНСКІЯ НА ЭКРАНЕ

ГЭТЫМІ ДНЯМІ ВЫЙДЗЕ З ДРУКУ І БУДЗЕ РАЗАСЛАНЫ ПАДПІСЧЫКАМ
№ 1 ЧАСОПІСІ № 1
„Сацыялістычнае Будаўніцтва"
(б. «САВЕЦКАЕ БУДАЎНІЦТВА»).
ЗЬМЕСТ.
1. М. М. Кар[illegible]—Аб далейшых задачах па хэмізаньні народнае гаспадаркі і аб працы хэмкамітэту БССР.
2. А. Копло[illegible]—Прамфінплян рэспубліканскай прамысловасьці на БССР на 1929-30 г.
3. Ф. Л. [illegible]—Арганізацыя тарпянога аддзелу і-ту прамысловасьці БССР і праграма па навукова-дасьледчых работах.
4. В. Фем[illegible]—Мэтады дробнага эканамічнага раёнаваньня.
5. Праф. [illegible]—Навуковая работа, як фактар сацыялістычнай перабудовы с.-г.
6. А. М. [illegible]—Да пытаньня вылічэньня сабекошту прадуктаў с.-г.
7. А. А. [illegible]—Да пытаньня штучнага лесаадваўленьня ў БССР.
8. А. Хо[illegible]—Аб кіруючай ролі с.-с. у калгасным будаўніцтве і датэрміновых перавыбарах.
9. Я. Р[illegible]—Функцыянальная структура ў наркаматах і цэнтральных установах БССР.
10. Ул. [illegible]—Літаратура па эканоміцы і савецкім будаўніцтве БССР.
Дынам[illegible]ароднай гаспадаркі БССР (стат. бюлетэнь № 1 (26) і інш.

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" званоце па тэл. 7-81


## Згубленыя і ўкрадзеныя наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Даведка аб хваробе Балюшкова І. С., выд. Крэменч. вайск. шпіталем. 134
Каап. кн. № 2156 Цыбулка А. Д., выд. Барысаўск. прыгар. спаж. т-вам. 135
Чл. кн. саюзу СГЛР Харытонавай Г. [illegible]
Чл. кн. ТПО Камарова Ц. І., выд. [illegible] рысаўск. ТПО. 138
з. пасьведч. № 17/п, чл. кн. са[illegible]ўначнікаў № 49045, кн. касы [illegible]памогі № 75 Ніліпчыка Ф. Е. 139
біл. Ігнатовіча П. М., выд. Ба[illegible]ваенкаматам. 140
біл., даведка Гарсавету, страх. [illegible]ькіна Т. С. 141
кн. Пліско Б. М., выд. Ле[illegible] РВК. 142
к. карт. Бічукова Е., выд. Ча[illegible] РВК. 143
Вайск. біл. Андрэенка І., выд. Ка[illegible] раўскім РВК.
Пашпарт № 177/12757 Ігуадэсмана [illegible] М., выд. Лепельск. міліцыяй.
Вайск. біл. Сініца І., выд. Макеў[illegible] РВК.
Вайск. біл. Драздова І., выд. [illegible] домальск с/с.
Каап. кн. № 4418 Дашчынскага С. [illegible] выд. Барысаўск. прыг. спаж. т-ва. [illegible]